Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КРАСАВІК 29 1933 г. № 94 (4638)

Год выдавьня XVI

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Рабочыя і работніцы! Авалодвайце тэхнікай вытворчасьці. Змагайцеся за высокую якасьць прадукцыі, за зьніжэньне сабекошту, за ўздым прадукцыйнасьці

(З ПЕРШАМАЙСКІХ ЛЁЗУНГАЎ ЦК УсеКП(б))

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАТА

Яшчэ 15 год таму назад Уладзімер Ільіч у сваім артыкуле «Як арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва» пісаў: «Сацыялізм ня толькі не пагашае спаборніцтва, а наадварот, упяршыню стварае магчымасьць ужыць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, ущапчуць сапраўды больш працоўных на арэну такой работы, дзе яны змогуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, выявіць таленты, якіх у народзе непачатая крыніца і якія капіталізм маў, ціснуў, душыў тысячамі і мільёнамі».

Гэтыя наказы Леніна збыліся. Сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва стаў баявым сьцягам мільённых мас пралетарыяту і калгасьнікаў краіны Саветаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва сапраўды адкрыла невычарпальную крыніцу творчай ініцыятывы рабочай клясы, выклікала да жыцьця таленты пралетараў, творачыя «цуды» ў справе будаўніцтва сацыялізму.

Па шляху ленінскага спаборніцтва і ўдарніцтва, пад сьцягам камуністычнай партыі, на чале з лепшым ударнікам тав. **Сталіным**, крочыць стройнымі калёнамі шматмільённая рабочая клясa да ўсё новых і новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Пяцігадовы плян — гэта шырокі стратэгічны плян наступленьня сацыялізму на ўсім фронце.

Гераічна, на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва выканана пяцігодка за 4 гады. Пралетарыят Савецкага саюзу ўжо за гады першай пяцігодкі паказаў нябывалыя ў гісторыі чалавецтва тэмпы будоўлі. «Форд будаваў свае вядомыя заводы 5 і больш гадоў. Савецкі-ж саюз ленінскімі мэтадамі пабудаваў сусьветны гігант — Сталінградзкі трактарны завод усяго за 11 месяцаў, аўтамабільны завод імя Горкага — за 15 месяцаў. Амэрыканскія спэцыялісты меркавалі сабраць і ўстанавіць канструкцыі механічна-абарачнага цэху за 162 дні. Савецкая арганізацыя — Трактарабуд — вызначыла 62 дні. Сталінградзкія ўдарнікі на аснове сацыялістычнага спаборніцтва выканалі гэта заданьне ўсяго за 28 дзён. У ліцейным цэху для ўстанаўленьня вагранак адводзілася 16 дзён, а ўдарнікі ўстанавілі за 6 дзён.

Гонар сацыялістычнай энэргетыкі — **Днепрадрэс** — пабудован выключнымі тэмпамі.

1930 год. Плян прадугледжваў укладзьці 427.000 кбм. бэтону. Дняпроўскія будаўнікі высучылі 500 тыс. кбм., а ўкалалі сапраўды 518 тыс. кбм. Гэтым самым пралетарыят Савецкага саюзу ўпісаў у гісторыю новы сусьветны рэкорд.

Такімі-ж ударнымі тэмпамі будаваліся і іншыя гіганты сацыялістычнай індустрыі СССР і БССР.

Ва ўпартай клясавай барацьбе, перамагаючы ў працэсе росту труднасьці сацыялістычнай пераробкі краіны, выкрываючы і скарпушаючы апартуністаў усіх масьцей, выкарчоўваючы старыя навыкі, пралетарыят СССР пад кіраўніцтвам свайго авангарду — камуністычнай партыі, на аснове ленінскага сацыялістычнага спаборніцтва будуе бясклясавае грамадзтва.

Сацыялістычнае спаборніцтва ёсьць «камуністычны мэтад будаўніцтва сацыялізму на аснове максымальнай актыўнасьці мільённых мас працоўных... Ёсьць вагар, пры дапамозе якога рабочая клясa заклікана перавярнуць усё гаспадарчае і культурнае жыцьцё на базе сацыялізму» (**Сталін**). Яно згуртавала вакол партыі лепшых сыноў... барацьбітоў за справу сацыялізму, згуртавала тых, якія «схапілі ленін сутнасьць сацыялізму».

Сацыялістычнае спаборніцтва зьяўляецца рашаючым сродкам у справе выхаваньня рабочых і калгасных мас, бо яно «пераварае працу в ганебнага і цяжкага ярма, якою яна лічылася раней, у справу гонару, у справу славы, у справу адвагі і геройства» (**Сталін**).

На пачыну перадавых рабочых сацыялістычным спаборніцтвам ахоплены зараз самыя аддаленыя і глыбінныя куткі Савецкага саюзу. Няма такой фабрыкі, заводу, няма такога калгасу і саўгасу, дзе-б ня было ўдарнікаў.

Такіх посьпехаў у справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва пралетарыят, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дасягнуў у выніку непрымірымай барацьбы партыі, на чале з тав. Сталіным, супроць апартуністычных скажэньняў ленінскага спаборніцтва. Былое праваапартуністычнае кіраўніцтва УсеЦСПС прабавала бюракратызаваць жывое кіпучае сацыялістычнае спаборніцтва. Партыя за рашучы адпор гэтым спробам перашкодзіць разгортваньню сацыялістычных форм працы і скажэньням ідэй ленінскага спаборніцтва.

Пралетарыят яшчэ больш згуртаваўся вакол партыі і ўзьняў вышэй сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва. «Усюды на шахтах, на фабрыках, заводах, саўгасах, калгасах разьлілася хваля спаборніцтва, спаборніцтва на камуністычнай дысцыпліне працы, на вышэйшай прадукцыйнасьці яе, на зьніжэньні яе кошту» (**Молатаў**). Ад перших ударнікаў, пасобных брыгад да 4-мільённай арміі перадавікоў, — вось вымах ленінскага спаборніцтва.

Пралетарыят Савецкай Беларусі хутка падхапіў вялікі пачын перадавікоў сацыялістычнай індустрыі пралетарскіх цэнтраў Савецкага саюзу.

Калі ў верасьні 1929 году ўдарніцтвам было ахоплена ўсяго 3 проц. рабочага калектыву БССР, то ў сьнежні гэтага-ж году гэты процант дасягае 15.

У сакавіку 1930 году ленінскі заклік яшчэ больш ускалыхнуў працоўныя масы Савецкай Беларусі. Спаборніцтвам ахоплена ўжо 46 проц. Уздым творчай ініцыятывы і палітычная актыўнасьць рабочай клясы на аснове пераможнага будаўніцтва сацыялізму шырыць рады ўдарнікаў па ўсіх куткох Савецкай Беларусі.

63 проц. рабочых ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам, 30 проц. — таспадарча-разрахунковымі брыгадамі — вось выпік разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва ў БССР.

На працягу пятай гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва работа ўдарнікаў павінна быць накіравана на выкананьне задач другой пяцігодкі і народна-гаспадарчага пляну 1933 году.

Цэнтральная задача сёньняшняга дня — **гэта асваеньне новых заводаў і новай тэхнікі, павышэньне прадукцыйнасьці працы, зьніжэньне сабекошту і паляпшэньне якасьці прадукцыі ў галіне прамысловасьці, узьняцьце ўраджайнасьці і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. У гэтым зараз галоўнае.**

Гэтыя лёзунгі ленінага ўдарніка сацыялістычнай будоўлі тав. Сталіна ёсьць асноўны зьмест далейшага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Выпрацаваць добраякасную такную прадукцыю пры найменшай затраце часу і матар'ялаў — вось дзвіз сацыялістычнага спаборніцтва. Дабіцца рэалізацыі яго — першая задача кожнага ўдарніка, кожнай брыгады. **Важнейшым зьвяном у барацьбе за павышэньне прадукцыйнасьці працы зьяўляецца асваеньне і поўнае выкананьне новых тэхнічна-ўгрунтаваных норм, асваеньне поўнай магутнасьці прадпрыемства.**

Тут камуністы сваім асабістым прыкладам і шырокай агітацыйна-масавай работай павінны адыграць асаблівую ролю.

Калдагаворная кампанія ўзьняла яшчэ больш творчую ініцыятыву рабочае клясы. Толькі на 24 прадпрыемствах Савецкай Беларусі за час калдагаворнай кампаніі было высунута самімі рабочымі **1.206** сустрэчных норм, якія значна ўзьнялі прадукцыйнасьць працы. На адным Гомэльмашы сустрэчныя нормы даюць эфэктыўнасьць **11,4** тыс. руб., на «Бальшавіку» — 7.000 руб. Унесена звыш **14.000** каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць мільёны рублёў эканомі.

Гэтыя нормы перадавікамі ўжо выконваюцца і перавыконваюцца.

Далейшая задача — разгарнуць масавае індывідуальнае і калектыўнае сацыялістычнае спаборніцтва ў справе мабілізацыі мас на поўнае асваеньне новых норм, хутчэйшую рэалізацыю рацыяналізатарскіх прапаноў.

Перанесьці вопыт лепшых брыгад, ударнікаў, скарыстаць сілу ленінскага прыкладу—чарговыя задачы партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Сацыялістычнае спаборніцтва — важнейшы батар у справе ўмацаваньня жалезнай пралетарскай дысцыпліны. Ударнік — гэта самы дысцыплінаваны рабочы, калгасьнік. Выкрываць гультаёў, рвачоў, лятуноў, весьці з імі самую непрымірымую барацьбу, як з дэзарганізатарамі сацыялістычнай вытворчасьці, — першы абавязак ударніка. Баяздольнасьць ударніка паказваецца ў барацьбе за стварэньне новай працоўнай дысцыпліны. Тут праяраецца і загартоўваецца яго рэвалюцыйная пільнасьць супроць рэштак капіталістычных элемэнтаў, якія пралезьлі і пралазяць на фабрыкі і ў калгасы.

Савецкі саюз — ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту. Нашы дасягненьні «мабілізуюць рэвалюцыйныя сілы рабочае клясы ўсіх краін супроць капіталізму» (**Сталін**). Гэта яшчэ больш натхняе энэргіяй ператварыць ленінскія ідэі камуністычных адносін да працы ў сродак будаўніцтва сацыялізму.

Веснавая сяўба — важнейшае зьвяно ўсяго народна-гаспадарчага пляну 1933 году.

Шырокая перадача вопыту сацспаборніцтва перадавікоў прамысловасьці на сацыялістычныя нівы, фэрмы, канкрэтная, жывая дапамога калгаснай вёсцы па ўкараненьні сацыялістычных форм працы, — вось баявая неадкладная задача пралетараў сацыялістычнай індустрыі.

Прасякнуць ва ўсе шчыліны калгаснага жыцьця, у брыгады, на поле, дапамагчы калгасам разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, на-ходу выправіць памылкі — першы абавязак прафсыянальных і шэфскіх арганізацый.

Падняць палітычна-рэвалюцыйную пільнасьць, накіраваць клясава-пралетарскую нянавісьць перадавікоў калгасьнікаў і адпаасобнікаў на канчатковую ліквідацыю кулацкага сабатажу — вось лёзунгі калгасных мас, якія забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне плану веснавой сяўбы.

АБ ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

ПАСТАНОВА ЦК і ЦКК УсеКП(б)

1. НЕАБХОДНАСЬЦЬ ЧЫСТКІ

Выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, перамога індустрыялізацыі ў СССР, посьпехі калгаснага руху і вялізарны колькасны рост рабочай клясы выклікалі новы ўздым палітычнай актыўнасьці пралетарыяту і сялянства.

На аснове гэтага ўздыму партыя павялічыла свае рады за апошні час з паловаю гады на 1.400 тысяч чалавек, давёўшы іх да 3.200 тысяч (членаў партыі 2 млн. чалавек і кандыдатаў 1.200 тыс. чалавек).

Аднак, пры масавым прыёме ў партыю, які праводзіўся на мясцох, часта агульна і бяз пільнай праверкі, у рады партыі пралезьлі чужыя элемэнты, якія скарыстоўваюць сваё прабываньне ў партыі ў кар'ерыстскіх і шкурніцкіх інтарэсах, праціраліся двурушніцкія элемэнты, якія на словах прысягаюць у вернасьці партыі, а на справе прабуюць сарваць правядзеньне яе палітыкі.

З другога боку, з прычыны нездавальняючага становішча справы марксыцка-ленінскага выхаваньня членаў партыі, у складзе партыі аказалася ня мала хоць і сумленных, но новых абараняць савецкую ўладу таварышоў, але ці невыстарчальна устойлівых, неразумеючых духу і патрабаваньняў партыйнай дысцыпліны, ці палітычна-малаграматных, ня ведаючых праграмы, статуту, асноўных пастаноў партыі і піздольных, з прычыны гэтага, актыўна праводзіць палітыку партыі.

Студзеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), улічваючы гэтыя абставіны, пастанавіў правесьці чыстку ў 1933 г. і «арганізаваць **справу чысткі партыі такім чынам, каб забясьпечыць у партыі жалезную пралетарскую дысцыпліну і ачышчэньне партыйных радоў ад усіх ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў».**

Партыя кіравалася пры гэтым пастановаю другога кангрэсу Камінтэрну ад 30 ліпеня 1920 году, у сілу якога «камуністычныя **партыі ўсіх краін, дзе камуністы вядуць сваю работу легальна, павінны праводзіць пэрыядычныя чысткі (перарэгістрацыю) асабістага складу партыйных арганізацый, каб сыстэматычна ачышчаць партыю ад няўхільна прамазаўшыхся да яе дробна-буржуазных элемэнтаў».**

Выходзячы з гэтай дырэктывы Камінтэрну, наша партыя правяла партыйную перарэгістрацыю 1920 году, чыстку партыі 1921 г., чыстку нявытворчых ячэек 1924 г., праверку вясковых ячэек 1925 г., чыстку 1929-30 г. Гэтыя чысткі і перарэгістрацыі, як вядома, умацоўвалі рады нашай партыі, падымалі яе баяздольнасьць, узмацнялі начуцьцё адказнасьці кожнага члена партыі за работу партыі.

2. ЗАДАЧА І НАПРАМАК ЧЫСТКІ

Задача чысткі партыі заключаецца ў павышэньні ідэалёгічнага ўзроўню членаў партыі, у палітычным і арганізацыйным умацаваньні партыі, далейшым узмацненьні давер'я да партыі мільёнаў беспартыйных мас. Гэта задача ажыцьцяўляецца пры чыстцы шляхам: а) правядзеньня адкрытай і сумленнай самакрытыкі членаў партыі і партыйных арганізацый, б) праверкі работы кожнай партыйнай ячэйкі з пункту гледжаньня выкананьня рашэньняў і ўказаньняў партыі, в) прыцягненьня да справы чысткі працоўных беспартыйных мас і г) вычышчэньня з партыі людзей, якія не апраўдваюць высокай годнасьці члена партыі.

З партыі вычышчаюцца:

1. Клясава-чужыя і варожыя элемэнты, якія ашуканскім шляхам праціраліся ў партыю і засталіся там для разлажэньня партыйных радоў.

2. Двурушнікі, якія жывуць ашуканьнем партыі, хаваюць ад яе свае сапраўдныя імкненьні і пад прыкрыцьцём ілжывай клятвы ў «вернасьці» партыі, працуюць сарваць на справе палітыку партыі.

3. Адкрытыя і скрытыя парушальнікі жалезнай дысцыпліны партыі і дзяржавы, якія ня выконваюць пастаноў партыі і ўраду, бяруць пад сумненьне і дыскрэдытуюць рашэньні і ўстаноўленыя партыйнымі планы балбатнёю аб іх «нерэальнасьці» і «неажыцьцёўнасьці».

4. Перараджэнцы, якія зрасьліся з буржуазнымі элемэнтамі, не жадаюць змагацца на справе з клясавымі ворагамі, не змагаюцца на справе з кулацкімі элемэнтамі, рвачамі, лодырамі, зладзеямі і раскрадальнікамі грамадзкай уласнасьці.

5. Каруперы, шкурнікі і абюракраціўшыяся элемэнты, якія скарыстоўваюць прабываньне ў партыі і службу ў савецкай дзяржавы для сваіх асабістых шкурніцкіх мэт, адарваліся ад мас і ня дбаюць аб патрэбах і запросах рабочых і сялян.

6. Тыя, якія маральна разлажыліся, раняюць сваімі непрыстойнымі паводзінамі годнасьць партыі, забруджваюць сьцяг партыі.

З прычыны таго, што сярод **членаў партыі,** уступіўшых за апошні час у рады УсеКП(б), ёсьць частка таварышоў, адданых справе рабочай клясы і паказаўшых на справе—на вытворчасьці, у калгасах—сваю адданасьць, але ня ўсвоіўшых самых элемэнтарных палітычных ведаў, неабходных для члена камуністычнай партыі — праграмы, статуту, важнейшых рашэньняў партыі—Цэнтральны камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія партыі рэкамэндуюць пры чысткі праводзіць такіх камуністаў у **кандыдаты партыі** ня ў выглядзе партспагнаньняў, а ў мэтах іх палітычнага выхаваньня і лепшай падрыхтоўкі з тым, каб праз год паставіць пытаньне аб іх пераводзе зноў у члены партыі, калі яны здолеюць за гэты год павысіць сваю палітычную граматнасьць, неабходную для члена партыі.

З прычыны таго, што ў выніку тых-жа абставін у складзе **кандыдатаў партыі** аказалася не малая колькасьць таварышоў, якія ня толькі ня маюць элемэнтарных палітычных ведаў, неабходных для кандыдата, але страдаюць яшчэ нестойлівасьцю і адсутнасьцю выстарчальнай вытрымаў пасьці з пункту погляду партыйнай дысцыпліны, Цэнтральны Камітэт і Цэнтральная Кантрольная Камісія партыі рэкамэндуюць пры чысткі пераводзіць такіх таварышоў з разраду кандыдатаў **у разрад спачуваючых** з тым, каб праз год паставіць пытаньне аб іх пераводзе зноў у кандыдаты, ці аб прыёме іх у члены партыі, калі праверка пакажа, што яны ў поўнай меры гатовы для гэтага.

3. ШЛЯХІ І СПОСАБЫ ЧЫСТКІ

Чыстка ёсьць выражэньне бальшавіцкай самакрытыкі нашай партыі. Яна павінна праводзіцца «ня гледзячы на асобы», з пункту погляду праверкі выкананьня членамі і кандыдатамі партыі важнейшых рашэньняў партыі, удзелу іх у сацспаборніцтве і ўдарніцтве, актыўнай барацьбы за прамфінплян, за выкананьне важнейшых гаспадарчых заданьняў, барацьбы з прагуламі, барацьбы з раскрадваньнем сацыялістычнай уласнасьці.

Да ўсіх членаў партыі камісія па чысткі павінна праклуляць патрабаваньні веданьня праграмы партыі, яе статуту, важнейшых рашэньняў партыі. Ня можа быць камуніста, які ня ведае праграмы, статуту сваёй партыі і яе важнейшых палітычных і арганізацыйных рашэньняў. Аднак, па місіі па чысткі не павінны пры індывідуальнай праверцы палітычнай граматнасьці задавацць прэтэраемому заблытаныя, «прыдумленыя», «каверзныя» пытаньні. Яны павінны лічыцца з агульным ўзроўнем развіцьця праяраемага з тым, каб па пакінуць за межамі партыі бязупоўна даказаўшых адданасьць справе партыі і будаўніцтву сацыялізму таварышоў, якія ня мелі магчымасьці ў выстарчальнай ступені ўзьняць узровень палітведаў, асабліва рабочых і калгасьнікаў.

Чыстка ні ў якім разе не павінна разглядацца ні праяраючымі, ні праяраемымі, як агульнае недавер'е партыі да камуністаў данай ячэйкі. Камісіі па чысткі павінны прыняць усе меры да таго, каб стварыць пры чысткі таварыскую абстаноўку, у якой кожны член партыі адчуваў-бы, што справа ідзе не аб расправе, а аб тым, каб дапамагчы партыі вынявіць і выкараніць усе недахопы партыйнай арганізацыі.

Камісіі па чысткі і ўсе члены партыі павінны даваць рашучы адпор тым, хто будзе прабаваць скарыстаць чыстку ў мэтах зьвядзеньня асабістых рахункаў, у мэтах групавой барацьбы, усім склочнікам і клаўзьнікам, а таксама тым, хто паправуе ашальмаваць камуніста за цьвёрдасьць правядзеньня ім лініі партыі ў барацьбе за партыйную дысцыпліну, рэжым эканоміі, выкананьне прамфінплану, свячасовае выкананьне збожжазагатовак, правільную падрыхтоўку да веснавой сяўбы, уборкі і разьмеркаваньня ўраджаю і паотул за цьвёрдасьць у адносінах дакладнасьці і выразнасьці работы партыйцаў, падначаленых таму ці іншаму таварышу, як кіраўніку.

У той-жа час павінен быць дан па менш рашучы адпор тым, хто будзе шальмаваць склочнікамі і клаўзьнікамі ўсіх тых, хто шчыра імкнецца дапамагчы партыі вынявіць у часе чысткі чужыя, нестойлівыя, ненадзейныя элемэнты ў яе радох, ці ўказаць на сапраўдныя ўпушчэньні, недахопы, памылкі і праступкі ў работе таго ці іншага таварыша ці цэлай арганізацыі.

Змагаючыся супроць бытавога разлажэньня і непрыстойных паводзін членаў партыі (п'янства, бытавое разлажэньне, бытавая змычка з чужымі элемэнтамі, антысэмітызм і таму падобныя зьявы, несумяшчальныя з годнасьцю камуніста), камісія па чысткі не павінна ні ў якім разе дапускаць дробязнага і прыдзіраўвага капаньня ў асабістым быту. Камісіі па чысткі павінны галоўную ўвагу зьвярнуць на тое, як партыец выконвае даручаную яму партыйнай справу, як ён змагаецца за ажыцьцяўленьне і выкананьне рашэньняў партыі.

Чыстка праводзіцца на адкрытых сходах ячэек з прыцягненьнем беспартыйных (у буйных ячэйках па цэхах, зьменах і ў асобных частках установы, па калгасах і саўгасах і г. д.), на якіх спачатку заслухоўваецца і абмяркоўваецца паведамленьне камісіі па чысткі аб мэтах і задачах чысткі і даклад бюро ячэйкі аб становішчы праяраемай арганізацыі.

Чыстку праходзяць усе члены і кандыдаты партыі за выключэньнем членаў і кандыдатаў ЦК і ЦКК УсеКП(б) і членаў рэвізійнай камісіі ЦК УсеКП(б), як выбраных зьездам партыі, а таксама начальнікаў палітаддзелаў МТС і саўгасаў, ужо праверэных партыяй пры іх назначэньні. Аднак, у выпадку падачы матываванай заявы тым ці іншым партыйным сходам ці асобнай групай членаў партыі з патрабаваньнем чысткі таго ці іншага члена ці кандыдата ЦК, ЦКК і рэвізійнай камісіі ці начальніка палітаддзелу МТС і саўгасу, — апошнія павінны прайсьці чыстку.

4. КІРАЎНІЦТВА ЧЫСТКАЮ

Кіраўніцтва чысткаю ва ўсесаюзным маштабе даручаецца Цэнтральнай Камісіі па чысткі ў складзе т т. Рудзутака (старшыня), Л. М. Кагановіча, Кірава, Яраслаўскага, Шкіратава, Ежова, Стасавай і Пятніцкага.

Для кіраўніцтва чысткай у краявых і абласных арганізацыях і нацрэспубліках назначаюцца цэнтральнай камісіяй па чысткі адпаведныя камісіі па чысткі.

Абласныя, краявыя і рэспубліканскія камісіі па чысткі арганізуюць раённыя камісіі па чысткі.

Абласныя і раённыя камісіі па чысткі падбіраюцца з аўтарытэтных, бальшавіцка ўстойлівых, палітычна-граматных, ня буйных раней у іншых партыях, ня буйных у апазыцыі, вытрыманых камуністаў, з партыйным стажам ня менш 10 год.

Сыгіс членаў камісіі па чысткі свавчасова публікуецца ў мясцовым друку з тым, каб у выпадку заяў на членаў камісіі па чысткі ці адводу іх цэнтральная камісія па чысткі магла разглядзець гэтыя заявы.

Члены і кандыдаты УсеКП(б), незадаволеныя пастановаю камісіі па чысткі, могуць гэтыя пастановы абскаржаць у месячны тэрмін у вышэйстаячую камісію па чысткі аж да цэнтральнай камісіі і зьезду партыі, як вышэйшага органу партыі.

Работа камісіі па чысткі павінна праходзіць пад кантролем усёй партыі, у тым ліку праяраемых арганізацыяй, у асаблівасьці партыйнага друку. Любая ячэйка можа на агульным сходзе ўзяць пад крытыку любую пастанову камісіі па чысткі і абскаржаць яе, што не асначае, аднак, скасаваньня гэтай пастановы. Члены камісіі па чысткі павінны памятаць, што за парушэньне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, за грубасьць і нетактычнасьць кры чысткі яны самі будуць прыцягвацца да партыйнай адказнасьці, як людзі, якія ганьбяць чыстку.

Чыстку пачаць з першага чэрвеня

Забясьпечыць неадкладны і рашучы пералом у тэмпах і якасьці сяўбы

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР

ЦК КП(б)Б і СНК БССР падкрэсьліваюць, што, ня гледзячы на налаўнасьць у гэтым годзе ўсіх спрыяючых умоў для бальшавіцкага правядзеньня веснавой сяўбы і загадзя прынятыя зусім канкрэтныя меры з боку ЦК і СНК па падрыхтоўцы і разгортваньні масавай сяўбы,—першыя даныя сьведчаць аб зусім ганебных тэмпах сяўбы як у цэлым па рэспубліцы, так і ў асабліваснасьці ці раду раёнаў: Гарадоцкім, Сураскім, Магілеўскім, Шкоўскім, Плешчаніцкім, Бабруйскім, Чырвонапольскім, Старадароскім, Церахаўскім і інш.

ПЕРШАЕ БАЯВОЕ ЗАДАНЬНЕ ЦК І СНК—засеяць да 25 красавіка 500 тыс. га аўса—сарвана. Паводле зводкі Наркамзему на гэты дзень засеяна ўсіх культур усяго 95.000 га або 3,8 проц. да ўсяго пляну.

Першыя рэзультаты сяўбы паказваюць, што кіраўніцтва большасьці раёнаў не разумее таго, што бальшавіцкае правядзеньне сяўбы ў гэтым годзе азначае ня толькі поўнасьцю і ў тэрмін выканаць пасеўныя планы, але, што асабліва важна, забясьпечыць ЯКАСНАЕ правядзеньне сяўбы. У пачэтку правядзеньня сельска-гаспадарчых работ ужо маюць месца масавыя агрэхі ў ворыве, дрэнная задзелка насеньня, рэзкае зьніжэньне норм высеву ў радзе калгасаў і саўгасаў, пасеў пасьля першага ворыва і без падрыхтоўкі зяблівы, пасеў непратручаным насеньнем і г. д.

Палявыя работы, якія пачаліся у ад назасобным сэктары, у сваю чаргу сыгналізуюць аб тым, што цэлы ряд арганізацый па-ранейшаму ігнаруюць ролю аднаасобнага сэктару ў выкананьні пляну веснавой пасеўнай кампаніі. Гэта ігнараваньне асабліва рэзка праяўляецца якраз у тых раёнах, дзе ўдзельная вага аднаасобнага сэктару яшчэ асабліва вялікая (Бабруйскі, Мазырскі, Пятрыкоўскі, Магілеўскі і інш.), што нельга расцаніць інакш як спробу пра стага зрыву зусім дакладных і ясных указаньняў партыі і ўраду па гэтым важнейшым пытаньні.

Саўгасы, якія ў гэтым годзе значна лепш забясьпечаны ўсім неабходным для пасьпяховага правядзеньня сяўбы (кіруючымі кадрамі, рабочай сілай, мэханічнай і жывой цягавай сілай, насеньнем і г. д.) цягнуцца ў хвасьце, што ўказвае на адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы за пасьпяховае правядзеньне сяўбы з боку дырэктароў і партыйных арганізацый саўгасаў і на адсутнасьць сапраўды апэрацыйнага кіраўніцтва імі з боку дырэктароў трэстаў і Ўпаўнаркамсаўгасаў.

Такое становішча ў самым пачатку разгортваньня масавай сяўбы, якое стаіць пад пагрозу бальшавіцкія тэмпы і якасьць сяўбы вясны гэтага году, мае месца толькі таму, што ў радзе партыйных і савецкіх арганізацый раёнаў і ў некаторых цэнтральных арганізацыях яшчэ ня вытручаны да канца элемэнты апартуністычных, благадушных адносін да сяўбы. У радзе месц пануюць самасупакоенасьць і стаўка на самацёк, што гаворыць аб адсутнасьці бальшавіцкай мабілізаванасьці на выкананьне дырэктыў партыі і ўраду і наяўнасьці гніла-ліберальных апартуністычных адносін да спроб кулацкіх элемэнтаў сарваць сяўбу ў тэрміны, вызначаныя партыяй і ўрадам з боку раду раённых арганізацый, дырэктароў саўгасаў і МТС, праўленьняў калгасаў і пазасобных партыйных ячэек.

ЦК І СНК прапануюць:

1. Наркамзему, Упаўнаркамсаўгасаў, райкомам, РВК, дырэктарам МТС і саўгасаў і начпалітаддзелам забясьпечыць неадкладна масавы выхад у поле ўсіх калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў. Устанавіць дзённыя заданьні для кожнага калгасу, саўгасу, вытворчага вучастку і для кожнай брыгады з тым, каб, штодзённа правяраючы выкананьне гэтых заданьняў, дабіцца скананьня сяўбы ва ўстаноўленыя тэрміны.

2. Наркамзему, Упаўнаркамсаўгасаў, усім раённым, партыйным і савецкім арганізацыям неадкладна праверыць выкананьне якасных паказальнікаў па ворыве і сяўбе, як гэта зроблена Менскім і Гомельскім гаркомамі з тым, каб у далейшым быў устаноўлен сапраўдны кантроль над тым, як праводзяцца мерапрыемствы партыі па павышэньні ўраджайнасьці. У тых выпадках (як гэта паказалі факты праверкі), калі пашкодніцку зьніжаюцца нормы высеву (па аўсе да 6 пудоў на га замест 10-12 пудоў—прыгарадныя гаспадаркі Менскага раёну, Пятрыкоўскі і інш.), неадкладна прыцягваць да самай суровай судовай адказнасьці. Таксама павінны быць прыняты меры па зьнішчэньні масавых агрэхаў у часе ворыва, недапушчэньні сяўбы пасьля першага ворыва, засеву непратручаным насеньнем, дрэннай задзелкі насеньня і г. д.

3. Неадкладна ўзмацніць барацьбу супроць маючых месца выпадкаў раскрадваньня насеньня ў радзе саўгасаў і калгасаў. Папярэдзіць, што, апрача фактаў простага раскрадваньня насеньня, гэта раскрадваньне праводзіцца ў часе сяўбы шляхам рэгуляваньня работы сявяркі ў бок штучнага зьмяншэньня выхаду насеньня, празьмерна рэдкай пасадкі бульбы і г. д. Усё гэта пры водзіць да простага кулацкага шкодніцтва ў справе барацьбы за ўраджайнасьць і зьніжае рэзультаты сяўбы. ЦК і СНК прапануюць усклясьці адказнасьць за якасьць пасеву і нормы высеву на брыгадзіраў, старшых рабочых саўгасаў, папярэдзіўшы іх, што за парушэньне норм высеву і за дрэнную арацоўку яны нясуць строгую судовую адказнасьць, як за зрыў важнейшых дзяржаўных мерапрыемстваў.

4. Адзначаючы выпадкі шкодніцкай расстаноўкі трактараў (Лепель, Чашнікі), якая выяўляецца ў тым, што пад трактарнае ворыва адводзены непадрых таваныя вучасткі з нізкай глебай, у той час, як вучасткі з высокай глебай адводзяцца пад конное ворыва,—ЦК і СНК патрабуюць ад партыйных арганізацый, дырэктароў МТС і саўгасаў, праўленьняў калгасаў строгага нагляду за правільным разьмеркаваньнем вучасткаў пад трактарнае і конное ворыва, дабіўшыся рацыянальнага скарыстаньня трактарнага парку.

ЦК і СНК прапануюць сакратаром райкомаў, дырэктарам і начпалітаддзелам МТС і саўгасаў, дырэктарам трактарных аб'яднаньняў т. т. Пушчыну, Грэбенчыку і Дубоўскаму неадкладна праверыць расстаноўку трактараў па калгасах і саўгасах, адвод зямельных вучасткаў для работы трактараў, поўнасьцю забясьпечыўшы выхад усяго трактарнага парку ў поле. Устанавіць штодзённы кантроль над работай трактарнага парку і ў бліжэйшыя дні дабіцца высокіх якасных паказальнікаў работы трактараў і трактарыстаў (эканомія гаручага, зьнішчэньне прастояў, барацьба з паломкамі трактараў, выпрацоўка нормы і г. д.).

5. За яўна нездавальняючую работу па сяўбе, за дапушчэньне правалу выкананьня заданьняў ЦК пэ пасеве аўса—абвясьціць вымову дырэктарам саўгасаў «Абчак»—Мандаркевічу, «Красьніца»,—Чарняку, імя Варашылава—Майсейка.

Указаць дырэктарам Аршанскага і Магілеўскага саўгастрэстаў, што з іх боку няма канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва работай, якое-б забясьпечыла выкананьне пастаноў ЦК аб веснавой сяўбе, і папярэдзіць іх, што калі ў бліжэйшыя дні ў саўгасах іх трэстаў ня будзе дасягнута рашучага пералому ў ходзе сяўбы, поўнасьцю забясьпечваючага выкананьне пастаноў ЦК, яны будуць прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці.

6. За неналаджанасьць належнага ўліку ходу пасеўнай і непрадстаўленьне ва ўказаныя ўрадам тэрміны зводак аб пасеве—абвясьціць вымову загадчыкам райзаў наступных раёнаў: Аршанскага, Дубровенскага, Сураскага, Плешчаніцкага, Бялыніцкага, Жлобінскага, Ельскага, Мазырскага, Рэчыцкага, Слуцкага і Старадароскага.

Указаць сакратаром райкомаў і старшыням РВК названых раёнаў, што адсутнасьць рэгулярнай справаздачнасьці аб ходзе сяўбы сьведчыць аб адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва з боку гэтых раённых арганізацый і прапанаваць ім арганізаваць такую пастаноўку работы, якая забясьпечыла-б своечасовы і дакладны ўлік ходу сяўбы.

7. Прапанаваць радакцыям цэнтральных газэт неадкладна ўстанавіць чырвоную і чорную дошкі для перадавых і адстаючых у сяўбе раёнаў, МТС, саўгасаў і калгасаў.

8. ЦК і СНК лічаць, што ўсякія спасылкі на няспрыяючае надвор'е, якое нібы перашкаджае масаваму разгортваньню сяўбы, па сутнасьці прыкрываюць апартуністычныя антыпартыйныя тэндэнцыі і граюць на руку кулаку, які імкнецца зацягнуць сяўбу і тым самым сарваць барацьбу партыі за павышэньне ўраджайнасьці.

ЦК і СНК папярэджваюць усе партыйныя арганізацыі і кіраўнікоў МТС, саўгасаў і калгасаў аб іх выключнай адказнасьці за правядзеньне сяўбы і што ЦК і СНК будуць сачыць за ходзам сяўбы ў кожным раёне, у кожнай МТС, у кожным саўгасе і ў далейшым непацерпяць ніякіх адступленьняў ад пастаноў партыі і ўраду як у адносінах тэрмінаў сяўбы, так і па правядзеньні мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці.

---

1 мая—дзень барацьбы рабочай клясы

Германская буржуазія думала, што яна зможа нанесьці рашаючы ўдар рабочай клясе, калі зьнішчыць яе авангард — камуністычную партыю і чырвоную прафпазыцыю. Аднак, ёй гэта не ўдалося. Удар прайшоў міма. Перайшоўшы на непегальнае становішча, кампартыя і чырвоныя прафсаюзы захавалі сваю арганізацыю, а разьбітымі аказаліся сацыял-дэмакратыя і рэфармісцкія прафсаюзы. Гэта значыць, што наступаючы на германскую рабочую клясу, германская буржуазія зьнішчыла цяпер тую плаціну, якая выратавала яе ад бальшавізму ў 1918 і 1923 гадох.

Сацыял-дэмакратыя абвясьціла цяпер аб сваёй гатоўнасьці разам з Гітлерам сьвятка

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ЛЕНІНСКАГА СПАБОРНІЦТВА І УДАРНІЦТВА!

„САМАЕ ВЫДАТНАЕ Ў СПАБОРНІЦТВЕ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, ШТО ЯНО РОБІЦЬ КАРЭННЫ ПЕРАВАРОТ У ПОГЛЯДАХ ЛЮДЗЕЙ НА ПРАЦУ, БО ЯНО ПЕРАТВАРАЕ ПРАЦУ З ГАНЕБНАГА І ЦЯЖКАГА ЯРМА, ЯКІМ ЯНА ЛІЧЫЛАСЯ РАНЕЙ, У СПРАВУ ГОНАРУ, У СПРАВУ СЛАВЫ, У СПРАВУ АДВАГІ І ГЕРОЙСТВА“ (СТАЛІН)

ГЕРОІ ВЫТВОРЧЫХ ПЕРАМОГ

Завод імя Варашылава. У першым квартале 1933 году выпушчана прадукцыі на **1.042** тыс. руб., што складае **101,3** проц. квартальнага плану. За дзьве дэкады красавіка прамфінплян другога кварталу выкананы на **36,6** проц.

На заводзе налічваецца **17** гаспадарча-разрахунковых брыгад, якімі ахоплена **149** рабочых. Лепшых ударнікаў на заводзе **375**, з іх герояў першай пяцігодкі—**44** чал. Усяго ахоплена сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам **625** чал., або **50** проц. усіх рабочых заводу.

Гарбарня «Бальшавік». Прамфінплян першага кварталу выкананы на **101,5** проц. За дзьве дэкады красавіка—на **95,4** проц.

Усяго на заводзе рабочых **714** чал. Арганізавана **40** гаспадарча-разрахунковых брыгад, якімі ахоплена **96** проц. усіх рабочых гарбарні.

Лепшыя ўдарнікі па асваеньні новых норм т. т. **Гурэвіч, Суткавер, Рыўкін і Фунтман** на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва значна палепшылі якасьць прадукцыі, сыстэматычна перавыконваюць заданьні на 20-25 проц. Брыгадзе тав. **Баданзс** другога хромавага цэху перавыконвае новыя нормы на **30** проц. Яна выклікала на сацспаборніцтва брыгаду адмочнікаў на паляпшэньне якасьці прадукцыі, выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, добрае аўладаньне тэхнікай вытворчасьці.

Фабрыка «Настрычнік». Усяго рабочых **1.651** чал., з іх ударнікаў **1.326**. Арганізавана **30** гаспадарча-разрахунковых брыгад. Прамфінплян першага кварталу выкананы на **103** проц.

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады **Цялінскага, Фрэйлах і Мільман** выкналі прамфінплян за люты на **127,2** проц., за сакавік на **106,5** проц. У гэтых брыгадах кожны дзень абгаварваюцца добрыя і дрэнныя бакі работы, праводзіцца зьмена-сустрэчнае планаваньне. Кантрольныя лічбы прапараваны і даведзены да кожнага рабочага. Вядзецца рашучая барацьба з бракам і пераробкамі. Уся недобраякасная прадукцыя вярочаецца назад рабочаму, які яе вырабіў, з мэтай лік відацыі дэфэктаў.

Брыгада першай зьмены тав. **Дуль кевіч** у студзені выканала прамфінплян толькі на **95,1** проц. Але адразу-ж былі мабілізаваны ўсе рабочыя на ліквідацыю гэтага прарыву. У выніку ганебная пляма была зьмыта. Лютаўскі плян гэтай брыгады выкананы на **104,8** проц., сакавіцкі на **105** проц.

Рэчыцкі камбінат «10 настрычнік». Квартальны плян па выпуску агульнай прадукцыі выкананы на **102** проц. за дзьве дэкады красавіка—на **102** проц. Квартальная праграма па выпуску экспартнай прадукцыі выкананы на **92** проц., за дзьве дэкады красавіка—на **106** проц. Такія паказальнікі камбінат мае ўпершыню.

Усяго па камбінаце працуе **2.020** чал., з іх ударнікаў **1.659**. Лепшымі гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі на камбінаце зьяўляюцца: брыгада **Абрамовіча**, якая выканала квартальны прамфінплян на **105** проц., брыгада **Ільіной**—на **111,9** проц., брыгада **Гарбылёва**—на **100,7** проц., брыгада **Самочына**—на **121,5** проц.

Віцебскі шчацінны камбінат. Студзеньскі прамфінплян камбінат выканаў па 93,5 проц., за люты—102,8 проц., за сакавік — 111,7 проц. У выніку прамфінплян першага кварталу выкананы на 102,9 проц.

Першую пяціднеўку красавіка праграма была выканана толькі на 88,5 проц. Гэта невыкананьне прамфінпляну тлумачыцца тым, што быў вялікі недахват цывікоў, з-за якіх апрацоўчы цэх меў прастоі. Рабочыя пакрылі гэта недавыкананьне ў другой пяціднеўцы. 6 красавіка праграма была выкананa на 149,9 проц., 7 красавіка — 124,3 проц. і 8 красавіка — на 113,9 проц.

Самае галоўнае тое, што разам з павышэньнем колькасных паказальнікаў рабочыя камбінату павысілі і якасьць прадукцыі. Квартальнае заданьне па якасьці выкананa на 113,7 проц. Заданьне па прадукцыйнасьці працы ў студзені на адзін чалавекадзень было 19 руб. 31 кап., а выкананa на 21 руб. 96 кап., у лютым заданьне было 18 руб. 92 кап., выкананa — 21 руб. 40 кап. Зьніжэньне сабекошту за квартал, замест 2,5 проц. па плану, складае 3,65 проц.

БАРЫСАЎ. У рады перадавых па выкананьні прамфінпляну вышаў дрэваапрацоўчы камбінат **«Камінтэрн»**. Прамфінплян першага кварталу выкананы на 100 проц. (дырэктар т. Блоцкі, сакратар парткалектыву т. Бадзіноў, старшыня фабкому тав. Чырвонатонаў).

Лесапільны цэх камбінату за трэцюю пяцідзенку ў красавіку месяцы выканаў прамфінплян па **106,3 проц.**, у тым ліку па экспарту на **107,1** проц. Прырост прадукцыі ў параўнаньні з папярэдняй пяцідзенкай складае **6,8 проц.**

Капільны цэх камбінату выканаў плян на **115,2 проц.** Ударнымі тэмпамі ліквідуюць прарыў першага кварталу рабочыя мэблевага цэху, які ў трэцяй пяцідзёнцы красавіка выканаў сваё заданьне на **107,9 проц.**

ГОМЕЛЬ. На Гомсельмашы, згодна намечанага пляну трэба было пераглядзець 490 заніжаных і ўстарэўшых норм. На сёньняшні дзень ужо пераглядзана 526 норм, з эканоміяй 109.840 рублёў. Добраахвотна зьнізілі расцэнкі **113 рабочых.** Ініцыятарамі зьявіліся лепшыя ударнікі т. т. Каган, Лебядзінская, Сокалаў, Якубаў і Барадзінскі.

На фабрыцы **«Камінтэрн»** пераглядзаны 200 норм з эканоміяй **128.310 руб.** Вырасла армія ўдарнікаў — перадавікоў сацыялістычнага фронту. Ударныя прыклады работы паказалі брыгады фабрыкі **«Камінтэрн»** т. т. Айрама, Шусьцінай, Хайкіна, Бахоўка, Катаржыцкага, якія перавыконваюць свае пляны.

Разгарнулася работа па асваеньні новых норм па Палесдруку. Возьмем пераплётны цэх. Норма выпрацоўкі калянкоравых пакрышак устаноўлена 1.800 штук супроць 1.200 — у мінулым. Гэта норма па рэцы сшыткаў павялічана з 3.400 да 5.450 і асвоена. Заўсёды перавыконваюць сваю норму ўдарнікі Хэйфэц і Гусаў. Ім належыць вядучая роля ў цэху.

Д—х.

ПА РЭЙКАХ ПРАБЕГЛА АПОШНЯЯ ВАГАНЭТКА...

Ліцейны цэх Менскага заводу **«Камунар»** дыша паўдакроўным жыцьцём. Вогнемнымі пырскамі іскрыцца ва гранка. Плавіцца гарачы чыгун. Працуюць заліўшчыкі.

Брыгадзір тав. **Руцкі** пільна ўглядаецца ў кожную новую адлітую дэталь. Высокі і хударлявы, ён хутка на хіляецца над імі, клапатліва ачышчае ад пяску.

Руцкі прышоў на завод «Камунар» у 1930 годзе. Раней, з 1918 па 1921 год, быў у Чырвонай арміі, змагаўся на франтох грамадзянскай вайны. Потым працаваў на торфараспрацоўках, быў чорнарабочым. **А зараз ён брыгадзір лепшай брыгады заліўшчыкаў.**

Кожны недахоп у рабоце надзвычай хвалюе Руцкага. Брыгадзірам ён стаў у канцы 1932 году. Тады частыя прастоі нярвавалі брыгаду. Але дапамагла рабочая ініцыятыва: **Руцкі прапанаваў вывазіць ліцьцё ў абрубачны цэх сіламі сваёй-жа брыгады.** Гэту прапанову зьдзяйсьняюць зараз заліўшчыкі, а завод атрымлівае эканомію—135-140 рублёў у месяц.

Руцкі працуе побач з рэдактарам брыгадкай пітоцзенкі **Сянкевічам.** Хлопцы часта кажуць рэдактару: **«Па суеш нешта, братка, газэта рэдка выходзіць у сьвет».** І на сваім сходзе брыгада пастанавіла: **«Так быць не павінна, штодзенку трэба выпіць».**

***

Расплаўлены чыгун з вагранкі пераліваецца ў вэрлікія коўшы. 5 пар рабочых па чарзе напаўняюць свае коўшы. Потым асьцярожна заліваюць формы. 500-600 пудоў чыгуну, тысячы новых дэталяй, калась нікоў адліваю гаспадарча-разрахунковая брыгада заліўшчыкаў.

Цэхам кіруе стары майстар тав. **Аўгусьціняк.** Ён большую частку свайго рабочага дня праводзіць у гарачай ліцейнай. Любіць Аўгусьціняк сваю работу. Ён заўсёды перасьцярагае моладзь: **«Ня трэба захвальваць брыгады, хай вучыцца як найлепш працаваць».**

Заліўшчыкі змагаюцца за лепшыя якасныя паказальнікі работы. Спаборніцтва паміж брыгадай і абрубачным цэхам абавязвае вырабляць прадукцыю без пяску, без паломак. Заліўшчыкі спаборнічаюць і паміж сабой. Адна пара выклікае другую, рабочыя абавязваюцца: не разьліваць чыгуну, не рабіць зарозаў (на мове ліцейшчыкаў «зароз» азначае—не даліць формы), не адбіваць формы пры нагрузцы. **На месцы праз кожныя 10-15 хвілін правяраецца ўнутры-брыгаднае спаборніцтва.**

Заліўшчыкі-перадавікі ліцейнага цэху вядуць сур'ёзную барацьбу з бракам.

—У лютым брак даходзіў у нас да 1—2 проц. Цяпер-жа маем 0,5 проц. Мы паставілі сваёй мэтай давесьці брак і пераробкі да нуля. Гэтага мы дабіемся ў бліжэйшы час!—гаворыць брыгадзір тав. Руцкі.

Слова «бракароб» становіцца самым ганебным словам.

Жорсткі бой абвясьціла брыгада прагулам і пашойкам. У сакавіку 1933 году ўжо ня было ні аднаго прагулу і спазьненьня бяз уважлівых прычын. Няма іх і ў красавіку.

За ўдарную і сумленную работу брыгада атрымала ад кіраўніцтва заводу ганаровую грамату. Гэта пачасная прэмія—гордасьць заліўшчыкаў. Высока трымаюць яны сьцяг перамог. Кожны заліўшчык зьяўляецца актыўным будаўніком сацыялізму, ён разам з тым разумее, што бяз ведаў, бяз культуры нельга ісьці наперад. Школу па тэхмінімуму наведвае ўся брыгада.

***

Рабочы дзень заканчваецца ў 10½ гадзін вечара. Спыняецца работа мэханізаванага крану. На рэйках прабегла апошняя ваганэтка—усе гатовыя дэталі перавезены ў абрубачны цэх.

Брыгада ідзе на адпачынак. Красавіцкі вецер цёплай хваляй абвейвае твары заліўшчыкаў. На другім канцы заводзкага двара блішчыць агнявымі вачыма клюб. Адтуль пясьцца звонкая, маладая песьня:

«Гудит, ломая скалы,
ударный труд!
Прорвался песней алой
ударный труд!..»

КАГАН.

ПЕРАМОГ ЗЬМЕННЫ СУСТРЭЧНЫ

— Чарговую нараду лічу адкрытай. Перад намі адно пытаньне—абмеркаваньне вытворчага заданьня. Нашай брыгадзе дадзена 459 адзінак. Вашае слова, таварышы.

— Лічу, што можна згадзіцца,—заяўляе ўдарніца **Нахман.**

— А па маёй думцы, можна высунуць сустрэчны, даць 480,—прапануе Нахман лепшая ўдарніца **Каган.**

— Прыняць - то прыняць, а вось, каб по падзачаў першы вучастак,—сумняваецца некалькі галасоў.

Практычна, па-дзелавому абмеркавалі гаспразрахункоўцы сваё цэннае вытворчае заданьне і прышлі да аднадушнага выраду: сустрэчны прыняць, узяць на буксір першы вучастак, перадаць яму трох сваіх ударнікаў, пакінуўшы ў сябе 9 замест 12 паводле пляну.

***

Капвэр вялікага польтавага цэху набыў поўны ход. Пад грук машын, адбіваючых такт ударнай работы, кішэні, рукавы, каўняры з маланкавай хуткасьцю перадаюцца з рук у рукі, ператвараюцца ў гатовую адзінку.

— Хутчэй падавай падбарты, не затрымлівай капвэру,—гучыць голас брыгадзіры **Рудчанка Зіны.**

— Есьць,—адказваюць апошнія рукі першага вучастку.

Цяжка зраўнацца з брыгадай тав. Рудчанка. Яе не дагоніш. 9 энтузіястаў на чале з брыгадзірам трашна, спрытнымі рукамі запываюць лямкі, намётваюць падбарты, прышываюць кромку, заражаючы сваім творчым уздымам увесь другі вучастак.

***

2 гадзіны энэргічнай работы прадзелі нязьмяротна. Сямімінутны перапынак. Брыгадная дошка-нялжэй зіта рамі абвяшчае **«Выпушчана 131 адзінка».**

— Малэчата, таварышы, сустрэчны над патрэбай. Першым рукам трэба падзягнуцца,—заўважае тав. **Рудчанка.**

— І пра якасьць не забывацьмо,—дадае грамадзкі інспэктар брыгады па якасьці—ударніца тав. **Нахман.**

Рубільнік зноў уключан. Запрамчэла электрычнае сьвятло. Загуў трансьмісіі, зноў запрацавалі машыны. Работа пайшла яшчэ весялей. Першыя рукі ўжо больш не адстаюць, акуратна зашываюць лямкі, намётваюць падбарты.

... І калі фабрычная сырэна абвясьціла сканчэньне рабочага дня, **на брыгаднай дошцы ўжо было выведзена 510 адзінак бяз ніводнай пераробкі.** Ударная работа брыгады дала свае блискучыя рэзультаты. Зьменна-сустрэтны перамог.

***

Яшчэ ў лютым брыгада Рудчанкі знаходзілася ў радох адстаючых. І толькі дзякуючы добрасумленнай работе і правільнай арганізацыі працы быў зроблен пералом, дасягнуты вытворчыя посьпехі. **За 20 дзён красавіка брыгада выканала праграму на 106,5 проц.**

У брыгадзе няма абязьлічанай работы, абязьлічаных машын. Кожны прымацован да пэўнага працэсу, да пэўнай апэрацыі. За кожным замацаванa машына, якую ён чысьціць, змазвае, ахоўвае, як вока. Сама Руд-

Брыгадзір тав. РУДЧАНКА З.

чанка штодзенна перад работай прапрае гатоўнасьць машын, забясьпечанасьць рабочых матар'ыямі.

Брыгада ня ведае ні прагулаў, ні спазьненьняў, ня мае ні аднаго дысцыплінарнага спагнаньня. Яна першы ініцыятар добраахвотнага павялічэньня норм па сваіх вядучых апэрацыях—зашыўцы лямак, прышыўцы кромкі, намётцы падбартоў—у сярэднім на 10 процантаў.

Барацьба за якасьць—у цэнтры ўвагі гаспразрахункоўцаў. Брыгада вылучыла свайго грамадзкага інспэктара па якасьці—лепшую ўдарніцу т. Нахман, якая пільна сочыць за кожным малейшым дэфэктам, не выпускаючы з брыгады бракаванага напашыву. Брак і пераробкі ў брыгадзе амаль ліквідаваны: замест 2 проц., дапушчаных плянам, брак складае толькі 0,8 проц.

У разультаце энэргічнай барацьбы за эканомію матар'ялаў брыгада Рудчанкі дабілася эканоміі фарбатуры і толак у лютым і сакавіку на 130 рублёў.

Заключаны сацдагавор на спаборніцтва паміж брыгадай і цэхавай кантурай забясьпечыў наладжаньне дакладнага ўліку эфэктыўнасьці працы брыгады. Кожны член брыгады ведае аб разультатах сваёй штодзённай работы.

У часе раённага зьлёту ўдарнікаў калгасьнікаў брыгада Рудчанкі заключыла сацдагавор з вытворчай брыгадай т. **Шухта,** падшэфнага калгасу імя т. **Сталіна,** на датэрміновае выкананьне прамфінпляну другога кварталу і пасьляховае праведзеньне сяўбы.

Такі твар перадавых байцоў за баль шавіцкі плян, такавы гераічныя будні гаспадарча-разрахунковай брыгады польтавага цэху швэйнай фабрыкі **«Прафінтэрн»** на чале з брыгадзірам-камуністкай тав. Рудчанка.

Арк. Зарубежны, М. Узьдзін.
г. Віцебск, швейная ф-ка «Прафінтэрн».

БЭЛА КУН

РАЗЛАЖЭНЬНЕ II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ

Пралетарыят капіталістычных краін сустракае 1 мая чацьвертага году крызісу; працоўныя масы адной шостай зямнае кулі—Савецкага саюзу—сустракаюць 1 мая другой пяцігодкі пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва. Ва ўсім капіталістычным сьвеце лютуе спусташальны эканамічны крызіс. Больш 40 проц. усёй рабочай клясы бяз працы і хлеба. Вытворчыя сілы капіталістычнай гаспадаркі скарыстоўваюцца ня больш чым на 30-35 проц. Новае наступленьне на зарплату, ліквідацыя ўсіх сацыяльных заваяваньняў пралетарыяту, скарачэньне расходаў на культурныя патрэбы, няўхільна ўзрастаючае зьдзічэньне,—такі сёньня малюнак капіталістычнага сьвету. Кан ца крызісу ня відаць, але тым больш ясна вымалёўваюцца рысы новай сусьветнай імпэрыялістычнай вайны. Наступленьне фашызму, асабліва ў гітлераўскай Германіі, таксама сыгналізуе аб набліжэньні новай імпэрыялістычнай бойні. Але ў ня меншай ступені яно сыгналізуе і аб тым, што і палітычная сыстэма капіталізму, эканамічныя асновы якога пахіснуты, ідзе насустрач свайму краху. Фашызацыя дзяржаўнага апарату азначае кан цэнтрацыю ўлады ў руках буржуазіі з мэтай захаваць уладу ў форме няпрыкрытай дыктатуры, апіраючыся на сродкі жорсткага тэрору супроць пралетарскай рэвалюцыі. Гэта канцэнтрацыя дзяржаўнай улады адбываецца на ўжо пахіснутай пралетарскай рэвалюцыі глебе капіталістычнай сыстэмы і буржуазія канцэнтруе ў сваіх руках уладу ўжо аслабленую.

Паны сацыял-дэмакраты, праводзьвы II Інтэрнацыяналу, якія разважаюць аб «контр-рэвалюцыйнай сытуацыі», каб стрымаць рабочую клясу ад рэвалюцыйных дзеяньняў, якія пробуюць скарыстаць перамогу германскага фашызму ў сваіх контр-рэвалюцыйных мэтах, як яны гэта рабілі з займарскай «дэмакратыяй», не павінны забываць, што «глеба контр-рэвалюцыі так сама зьмяняецца рэвалюцыяй».

Устаноўленне дыктатуры Гітлера ў Германіі і Дольфуса ў Аўстрыі адбылося ў такі час, калі эканамічны крызіс капіталізму надзвычай звузіў мэнэўровыя здольнасьці буржуазіі. Гэта здарылася іменна таму, што на аснове сусьветнага эканамічнага крызісу да краінасьці абвастрыліся ўсе клясавыя і міждзяржаўныя супярэчнасьці імпэрыялістычных дзяржаў. Сацыял-дэмакратыя, якая ў першы пэрыяд міжнароднай рэвалюцыі стала цэнтрам усіх контр-рэвалюцыйных сіл, выбрала сваёй гістарычнай задачай прытуплень не гэтых супярэчнасьцяй. Гэтым шляхам ёй удалося на працягу пэўнага часу ня толькі заваяваць поўнае давер'е кіруючага буйнога капіталу, але і такім чынам падрыхтаваць пераход ад дэмакратычных мэтадаў буржуазнага панаваньня да фашысцкіх, што яна пры гэтым пераходзе сама сабе зламала шыю.

1 мая 1933 году, на рубяжы пятага году крызісу, застае II Інтэрнацыянал —арганізацыю буржуазных «рабочых» партый, партый контр-рэвалюцыі ўнутры рабочай клясы,—у стане нястрымнага развалу. Другі Інтэрнацыянал ідзе насустрач свайму распаду. Ня менш, чым два гады таму назад старшыня II Інтэрнацыяналу Эміль Вандэрвельда хваліўся тым, што «ня гледзячы на камуністычную палітыку расколу, Інтэрнацыянал у 1931 годзе прадстаўляе сабой колькасна значна большую сілу, чым у 1914 годзе. Няма ні аднай з прымыкаючых да яго буйных партый, якая-б ня прымала ўдзелу хоць-бы адзін раз у тэй ці іншай форме ва ўрадзе... Можна сказаць без перабольшэньня, што большасьць вы кананому сацыялістычнага рабочага Інтэрнацыяналу,—былыя і будучыя міністры. І гэта, безумоўна, доказ узрастаючай сілы».

«Узрастаючай сілы»—якой клясы? Гэта пытаньне зразумела, на ставіцца панам Эмілем Вандэрвельдэ. Гісторыя апошніх год даказ, аднак, на гэта пытаньне выразны адказ. Былыя міністры Прусіі ўмацоўвалі не магутнасьць рабочай клясы, але ўладу буржуазіі. Яны не падрыхтавалі перамогі пралетарыяту, але расчысьцілі шлях для Гітлера. Крывавы першамай 1929 году, нападзкі Цэрглібелем, быў рашэчным этапам падрыхтоўкі да фашысцкай канцэнтрацыі ўлады буржуазіі. Палітыка былога міністра замежных спраў ангельскага імпэрыялізму Артура Гендэрсона заключалася ў падрыхтоўцы правалу канфэрэнцыі па раззбраеньні і адначасова ў падрыхтоўцы пакту чатырох дзяржаў, які зьяўляецца новым этапам на шляху да сусьветнай імпэрыялістычнай вайны і антысавецкай інтэрвэнцыі.

У працягу ўсяго пасьляваеннага пэрыяду II Інтэрнацыянал быў прыдаткам да міжнароднага апарату імпэрыялізму—Лігі нацый: гэта—інтэрнацыянал буржуазных «рабочых» партый, якія, кожная ў паасобку, прытрымліваліся палітыкі цеснага клясавага супрацоўніцтва ў адносінах да свайго ўласнага імпэрыялізму, да сваёй уласнай буржуазіі.

Ніхто іншы, як сам Вандэрвельдэ быў вымушан прызнаць, што партыі другога Інтэрнацыяналу не зьяўляюцца прадстаўнікамі пралетарскага інтэрнацыяналізму. У сваім артыкуле, напісаным непасрэдна перад венскім кангрэсам II Інтэрнацыяналу ў лістопадзе 1931 году, ён гаварыў:

«Я мог-бы прывесьці ў адносінах да ўсіх краін новыя доказы, якія сьведчаць аб тым, як мы цяпер, калі сацыял-дэмакратыя стала сапраўднай масавай партыяй, па-герла пагрузьлі ў сацыял-патрыятызьме. Некаторы час таму назад у бэльгійскай палаце, калі мы ў барацьбе супроць крэдытаў на ўзбраеньне выконвалі свой міжнародны абавязак (?), адзін сацыялістычны дэпутат заявіў, што з часу вайны ён не падаваў рукі ні аднаму немцу. Амаль у той-жа самы час у адказ з камісіі рэйхстагу адзін наш нямецкі таварыш заяўляе, што ў пытаньні абароны краіны ён стаіць на баку генэрала Гранэра, супроць камуністаў».

З пралетарскім інтэрнацыяналізмам II Інтэрнацыянал пасьляваеннага пэрыяду нікоўі ні меў нічога агульнага, і ня мог мець, бо прадпасылкай пралетарскага інтэрнацыяналізму зьяўляецца клясавая барацьба супроць уласнай буржуазіі.

Што-ж дзіўнага ў тым, што II Інтэрнацыянал, які, грунтуючыся на формуле Каўцкага, што «Інтэрнацыянал — зброя міру», прабаваў ашукаць рабочую клясу ўсіх краін, сьцьвярджаючы, што ён будзе існаваць і ў часе вайны,—з ганьбой распаўся яшчэ да таго, як выбухнула новая імпэрыялістычная вайна?

ГЕРМАНСКАЯ САЦЫЯЛ - ДЭМАКРАТЫЯ фактычна спыніла сваю сувязь з II Інтэрнацыяналам. Яе старшыня, выдатны член бюро II Інтэрнацыяналу, Отто Вэльс—заявіў аб салідарнасьці яго партыі з нацыянальнай палітыкай ня толькі «меншага зла» генэрала Гранэра, але і «большага зла» —Адольфа Гітлера.

НЕЗАЛЕЖНАЯ РАБОЧАЯ ПАРТЫЯ АНГЛІІ таксама афіцыяльна выйшла з II Інтэрнацыяналу і, наперакор усім намаганьням сваіх правадыроў, на сваім апошнім зьезьдзе пастанавіла ўстанавіць сувязь з камуністычным Інтэрнацыяналам.

ФІНЛЯНДСКАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЯ таксама пагражае выхадам з II Інтэрнацыяналу.

Значныя групы ЧЭХА-СЛАВАЦКАЙ САЦЫЯЛ - ДЭМАКРАТЫІ патрабуюць ад свайго партыйнага кіраўніцтва разрыву зносін з Цюрыхам.

Прымыкаючы да II Інтэрнацыяналу, Амстэрдамскі Інтэрнацыянал прафсаюзаў, ня ў меншай ступені ахоплен раз валам. Па загаду Гітлера «свабодныя германскія прафсаюзы» фактычна пераравалі сваю сувязь з амстэрдамскім прафсаюзным Інтэрнацыяналам. З «Усягульнага аб'яднаньня германскіх прафсаюзаў» узялі прыклад і паасобныя прафсаюзы. Па прапанове Тарнова—галоўнага доктара капіталізму, германскі саюз дрэваапрацоўшчыкаў афіцыяльна пераравў услякую сувязь з міжнароднымі арганізацыямі. Іншыя арганізацыі таксама ня вельмі будуць хістацца перш, чым зробяць такі крок.

Рэфармісцкія сындыкалісты ва Францыі пачынаюць такое-ж антыгерманскае цкаваньне ў інтэрэсах сваёй уласнай буржуазіі, як гэта было ў часе мінулай імпэрыялістычнай вайны ў сувязі са здрадніцтвам іх германскіх калег.

II Інтэрнацыянал і Амстэрдамскі Інтэрнацыянал прафсаюзаў яшчэ не распаліся. Але ў іх ідзе працэс распаду. «Мёртвыя крочаць шпарка».

Праводзьвы французкай сацыялістычнай партыі Леон Блюм прабуе растлу мачыць распад II Інтэрнацыяналу «глыбокімі тактычнымі разгалосьсямі» паміж германскай сацыял-дэмакратыяй і II Інтэрнацыяналам. Ён прабуе прадставіць справу такім чынам, быццам абедзьве групы ў II Інтэрнацыянале: французкая і германская уступілі ў спрэчкі па пытаньні аб мэтадах абароны дэмакратыі, па пытаньні: буржуазная дэмакратыя ці фашызм. Такім чынам ён хоча захаваць сярод рабочых ілюзію, быццам II Інтэрнацыянал, пры намсі тыл сацыял-дэмакратычных партыі, якія супрацоўнічаюць з выканкомам II Інтэрнацыяналу, сур'ёзна хочуць абараняць пралетарыят ад наступленьня буржуазіі на яго правы. На справе-ж распад II Інтэрнацыяналу зьяўляецца на выніком тактычных разгалосьсяў паміж пазсобнымі нацыянальнымі партыямі, а наадварот, ён зьяўляецца іменна выніком адноль кавай тактыкі ўсіх яго сэкцый, тактыкі супрацоўніцтва з уласнай буржуазіяй, з уласным імпэрыялізмам. У II Інтэрнацыянале сутыкнуліся ня два варожыя адзін другому прынцыпы і тактыкі, а два розныя нацыяналізмы, дзьве розныя імпэрыялістычныя плыні, дзьве варожыя одна аднэй імпэрыялістычныя агентуры—на аснове новых перагруповак імпэрыялістычных сіл, на этапе непасрэднай падрыхтоўкі вайны.

Отто Вэльс—правадыр ужо распаўшайся ў маральна-палітычных адносінах германскай сацыял-дэмакратыі, падтрымлівае нацыяналістычную, імпэрыялістычную палітыку, носьбітам якой ужо зьяўляецца фашызм. Ён салі дарыўецца з Гітлерам, шлях якога да «трэцяй імпэрыі», як сам Вэльс хваліўся ў Патсдаме, падрыхтавалі ён і яго партыя. Былы германскі сацыял-дэмакратычны прэм'ер Германіі Мюльлер адзін чыў, як гістарычную заслугу былога сацыял - дэмакратычнага прэзыдэнта Германскай рэспублікі Эбэрта, тое, што ён выратаваў «створанае крывёю і жалезам тварэньне Бісмарка» — германскую дзяржаву. Гэта «створанае крывёю і жалезам тварэньне Бісмарка» сацыял-дэмакратыя, цаною новых пастокаў рабочай крыві, крывёю дваццаці тысяч лепшых германскіх пралетараў, крывёю Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург, выратавала і захавала для «трэцяй імпэрыі» Гітлера.

Прышоўшы да ўлады германскі фашызм разам з італьянскім шукае саюзу з Англіяй, каб пачаць вайну супроць сваіх суседзяў—Польшчы і Францыі і супроць Савецкага саюзу і тым самым задаволіць новае імкненьне на ўсход» («дранг нах Остэн») пры дапамозе нічым напрыкрытай зброі германскага імпэрыялізму. Нацыянальная палітыка Гітлера—гэта працяг усёй пасьляваеннай палітыкі (таксама, як і ваенная палітыкі) германскай сацыял-дэмакратыі. Супрацоўніцтва с.-д. у II Інтэрнацыяле ў той пэрыяд, калі германскія імпэрыялісты гэта яшчэ допускалі і навет спрыялі, было нічым іншым, як абаронай тых-жа інтэрэсаў германскага імпэрыялізму, у імя якіх германскія сацыял-дэмакраты цяпер фактычна вышлі з II Інтэрнацыяналу.

Пан Леон Блюм абараняе імпэрыялістычныя інтэрэсы сваёй буржуазіі, яшчэ застаючыся на глебе дэмакратыі. Ён хацеў-бы, каб гэта дэмакратыя была захавана да таго часу, пакуль месца «дэмакратычнага свабоднага права» ня зойме ваеннае права. Яго супрацоўніцтва ў II Інтэрнацыянале мае мэтай пад прыкрыцьцём пацыфісцкіх словазьвяржэньняў адстойваць рэпарацыйныя інтэрэсы французкага імпэрыялізму. Але калі Вэльс выступаў у абарону інтэрэсаў свайго ўласнага імпэрыялізму ў духу пруськага фэльдфэбэля, то Леон Блюм мог і можа абараняць інтэрэсы французкага імпэрыялізму, выступаючы ў духу паўных французскіх «утончаных» інтэлігенцкіх копаў. Ён, аднак, зьяўляецца ня ў меншай ступені, чым Вэльс у адносінах да нямецкага імпэрыялізму, абаронцай французкага імпэрыялізму.

Ліга нацый—арганізацыя міжнароднага імпэрыялізму—таксама падпадае ўдарам з розных бакоў. Яна яшчэ раней II Інтэрнацыяналу ўступіла ў стадыю свайго развалу. Японія вышла з Лігі нацый. Яшчэ больш адчувальны ўдар, нанесены Лізе нацый Італіяй і Англіяй у выглядзе плянаў стварэньня пакту чатырох дзяржаў, які накіроман супроць гегемоніі Францыі ў Лізе і яе вядучай ролі на эўрапэйскім кантынэнце наогул. Арганізуемы Італіяй рэвізіяністкі блёк, які мае мэтай перагляд вэрсальскіх граніц і важнейшай апорай якога павінна зьявіцца Германія, прадстаўляе сабой нішто іншае, як замах на існаваньне прадуктаў Вэрсалю —Лігі нацый.

Невыпадковы распад Лігі нацый і распад II Інтэрнацыяналу супадаюць па часу. Распад Лігі нацый, перагрупоўка імпэрыялістычных сіл у паралку падрыхтоўкі да імпэрыялістычнай вайны маюць тыя-ж прычыны, што і распад II Інтэрнацыяналу.

Калі яшчэ на венскім кангрэсе германскія і французкія сацыял-дэмакраты, у адпаведнасьці з тагачаснай палітыкай сваёй буржуазіі, разглядалі як цэнтральнае пытаньне міжнародная палітыка— устаноўленьне франка-германскага зьбліжэньня,—то абвастрэньне франка - германскіх супярэчнасьцяй азначае заваёўце германскай і французкай сацыял-дэмакратыі варожых адна адной пазыцый і распад II Інтэрнацыяналу. Гэта паказвае, што фразы аб Інтэрнацыяналізьме II Інтэрнацыяналу ў пасьляваенны пэрыяд заўсёды былі хлусьнёй.

У процілеглась распаду II Інтэрнацыяналу 4 жніўня 1914 году, яго новы распад не зьяўляецца здрадніцтвам. Тады, у 1914 годзе сацыял-дэмакратычныя партыі здрадзілі сваім уласным рашэньням, накіраваным супроць абароны бацькаўшчыны, рашэньням другога Інтэрнацыяналу. Базэльскаму маніфэсту. Сёньня гэты распад азначае толькі працяг тэй палітыкі, якую II Інтэрнацыянал праводзіў да ўвесь пасьляваенны пэрыяд, праводзіў адкрыта (праўда, на паўных прамежках завуаляваўшы яе пацыфісцкімі фразамі). Кожная партыя II Інтэрнацыяналу будзе весьці далей палітыку сацыял-імпэрыялізму на сваю рызыку і страх. Пробным каменем інтэрнацыяналізму была вайна, цяпер ім стала непасрэдная падрыхтоўка вайны. Не дэмакратыя і фашызм процістаяць адзін аднаму ў загні ваючым II Інтэрнацыянале, але агентуры розных імпэрыялістычных сіл. Сацыял-дэмакратычныя агентуры імпэрыялістычных краін, у якіх дыктатура буржуазіі існуе ў дэмакратычных формах, выступаюць ў імя абароны дэмакратыі і разглядаюць германскую сацыял-дэмакратыю як нешта менш поўнацэннае, чым яны самі. Гэта азначае нішто іншае, як дапучэньне да тэй барацьбы, якую французкая групоўка дзяржаў вядзе супроць тых краін, у якіх пад кіраўніцтвам фашыстаў ідзе барацьба супроць Францыі, у імя ажыцьцяўленьня сваіх уласных імпэрыялістычных мэтаў.

Гутаркі аб «тактычных разгалосьсях» ня могуць прыкрыць таго факту, што шлях германскай сацыял-дэмакратыі—гэта шлях усяго II Інтэрнацыяналу.

Распад II Інтэрнацыяналу зьяўляецца ня толькі з гістарычнага, але і з актуальна - палітычнага пункту гледжаньня адным з важнейшых фактаў апошніх палітычных падзей. Ён азначае аслабленьне труднейшай перашкоды на шляху да стварэньня рэвалюцыйнага адзінага фронту пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Заўсёды быў толькі адзін Інтэрнацыяналізм: пралетарскі інтэрнацыяналізм сусьветнай рэвалюцыйнай партыі пралетарыяту.

Няхай-жа найшырэйшыя рабочыя масы з факту распаду II Інтэрнацыяналу пачэрпнуць яшчэ адзін рашэючы доказ, які яшчэ раз пацьвердзіць, што камуністы мелі рацыю, калі яны заўважалі, што II Інтэрнацыянал заўсёды быў органам зьнешня зьлаваючым сацыял-імпэрыялістычным партыі, гэта значыць арганізацыяй здрадніцтва інтэрэсаў пралетарыяту ў міжнародным маштабе, падобна да таго, як яго сэкцыі—сацыял - дэмакратычныя партыі—ажыцьцяўлялі гэта здрадніцтва інтэрэсаў рабочых у нацыяналь

ШЫРЭЙ ПЕРШАМАЙСКУЮ ПЕРАКЛІЧКУ САЎГАСАЎ, МТС, КАЛГАСАЎ

АДЗНАЧЫМ ГАДАВІНУ СПАБОРНІЦТВА І ПЕРШАМАЙ КРУТЫМ УЗДЫМАМ ТЭМПАУ І ЯКАСЬЦІ МАСАВАЙ СЯЎБЫ

РАПАРТУЕМ ДАТЭРМІНОВЫМ ЗАВЯРШЭНЬНЕМ СЯЎБЫ РАНЬНІХ

ГОМЕЛЬ, 28.

Калгасьнікі с.-г. арцелі **«ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ»** і імя **ЛЕНІНА** першымі **СКОНЧЫЛІ Ў ТЭРМІН СЯЎБУ** раньніх яравых культур.

Партыйная ячэйка калгасу «Шлях да сацыялізму» кінула ў поле ўсе свае сілы. Разам з брыгадамі шырока разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва на хутчэйшае завяршэнне сяўбы іншых культур. Штодзенна пасьля работы праводзяцца брыгадныя вытворчыя парады, на якіх кожная брыгада падагульвае вынікі ворыва і сяўбы за дзень.

Асабліва ўзорна працуе калгасьнік Міхась Барашкоў — адзін з арганізатараў калгасу «Шлях да сацыялізму». За ўвесь час палявых работ ён не дапусьціў ні аднаго агроху.

Калгасьнікі с.-г. арцелі імя Леніна арганізавалі пільны нагляд за якасьцю ворыва, баранаваньня і сяўбы. Вылучаны спэцыяльныя кантралёры.

На прыкладу гэтых калгасаў цэлы рад аднавасобнікаў Прудкоўскага сельсавету закончылі сяўбу раньніх збожжавых.

***

ЛЕЛЬЧЫЦЫ, 28. (Па тэлеграфу).

Калгасы **«ЧЫРВОНЫ АРАТЫ»** і **«ЧЫРВОНЫ ДАЗОР»** датэрмінова скончылі сяўбу раньніх яравых культур. Плян сяўбы выкананы. Калгасьнікі абавяжаліся да 1-га мая засеяць іншыя культуры.

ЧАЧЭРСК, 27. (Па тэлеграфу).

Першамай і гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва перадавыя калгасы раёну сустракаюць датэрміновым завяршэньнем сяўбы раньніх яравых.

Сьледам за калгасам **«САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»**, які адным з першых у раёне — 23 красавіка — поўнасьцю засеяў авёс, да тэрміну завяршылі сяўбу аўса калгасы **«ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»**, **«АДЗІНСТВА»**, **«ЧЫРВОНЫ АРАТЫ»**, **«УДАРНІК»** і інш.

***

ЛОЕЎ, 27. (Па тэлеграфу).

Калгас імя **СТАЛІНА** (Крупейскі сельсавет) поўнасьцю засеяў раньнія яравыя культуры. Аўса засеяна 53,5 га. ячменю 21 га, вікі 7 га і бабовых культур 15 гектараў. Плян пасеву бульбы выкананы на 26 красавіка больш чым на 75 проц.: з 93 гэктараў, паводле пляну, ужо засеяна 76 га. Сяўбу ільну калгас завяршае да 1 мая, пасьля чаго калгасьнікі пераключаюцца на дапамогу суседзям калгасам.

***

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА, 28. (Па тэлеграфу).

Паляводчая брыгада тав. **СЯКЕРЫЧА** (гл. «Зьвязду» ад 11 красавіка) калгасу «Прамень» першай скончыла да тэрміну сяўбу аўса. Засеяна 13,34 га. Пасеў бульбы будзе скончан да 1 мая на плошчы ў 24 га.

ТЭМПЫ СЯЎБЫ АУСА ПА РАНЕЙШАМУ ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫ

ЗАСЕЯНА АЎСА У ГЭКТАРАХ

20 КРАСАВІКА	23 КРАСАВІКА	25 КРАСАВІКА	27 КРАСАВІКА
12.129	15.709	27.299	51.063
2,4 проц. пляну	3,1 проц. пляну	5,4 проц. пляну	10,2 проц. пляну

ЗВОДКА НКЗ БССР НА 27 КРАСАВІКА

РАЁНЫ:	Засеяна ў га	Па сэктарах: Саўгасы	Калгасы	Аднавасобнікі
ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА				
Асьвейскі	—	—	—	—
Аршанскі	—	—	—	—
Бешанковіцкі	66	66	—	—
Віцебскі	80	9	71	—
Вушацкі	42	—	42	—
Гарадоцкі	9	—	9	—
Дубровенскі	—	—	—	—
Дрысенскі	213	—	207	6
Лёзьненскі	—	—	—	—
Лепельскі	1087	6	1061	20
Полацкі	2227	27	2112	88
Расонскі	273	—	247	26
Сураскі	—	—	—	—
Сянненскі	403	—	403	—
Сіроцінскі	25	—	25	—
Чашніцкі	676	—	673	3
Усяго	5101	42	4916	143
ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА				
Асіпавіцкі	159	—	128	31
Быхаўскі	110	—	96	14
Барысаўскі	955	51	642	262
Вялейскі	—	—	—	—
Гомэльскі	401	—	383	18
Дзяржынскі	127	30	97	—
Горацкі	25	2	22	1
Заслаўскі	635	82	535	14
Капыльскі	569	—	555	14
Крупскі	126	8	114	4
Капыльскі	996	—	954	42
Касьцюковіцкі	500	5	495	—
Клічаўскі	65	18	47	—
Дзяржынскі	746	—	684	62
Крычаўскі	15	—	15	—
Лагойскі	266	—	256	10
Магілеўскі	44	17	27	—
Мсьціслаўскі	79	—	79	—
Менскі	4028	749	3218	61
Крапоўскі	39	7	32	—
Пухавіцкі	835	94	462	279
Смалявіцкі	459	62	327	70
Талачынскі	59	26	33	—
Чэрвеньскі	35	8	24	3
Чаўскі	42	—	42	—
Чэрыкаўскі	139	—	135	4
Шклоўскі	47	—	47	—
Вузьдзенскі	289	42	243	4
Плешчаніцкі	124	1	120	3
Усяго	11914	1206	9812	896
ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА				
Брагінскі	1412	—	1013	399
Б.-Каталеўскі	816	—	779	37
Бабруйскі	145	—	77	68
Веткаўскі	750	112	478	160
Глускі	2572	285	1628	659
Гомельскі	754	249	448	57
Жыткавіцкі	768	105	585	78
Кармянскі	460	—	289	171
Камарынскі	600	—	513	87
Жлобінскі	109	—	53	56
Ельскі	1262	42	1114	106
Лоеўскі	1116	8	1040	68
Любаньскі	913	9	798	106
Лельчыцкі	961	5	584	371
Маязырскі	2079	133	1600	346
Нараўлянскі	1095	—	781	314
Парыцкі	2700	55	1557	1088
Пятрыкоўскі	1280	47	744	489
Рагачоўскі	1140	—	924	216
Рэчыцкі	2065	144	1150	771
Слуцкі	3860	93	3445	322
Старобінскі	3182	163	1703	1316
С.-Дароскі	73	—	54	19
Тураўскі	1077	19	590	468
Церахаўскі	162	—	79	83
Чачэрскі	285	38	25	222
Ч.-Слабодзкі	501	22	354	125
Ч.-Польскі	64	—	62	2
Уваравіцкі	509	160	310	39
Хойніцкі	1338	282	385	221
Усяго	34048	1972	23612	8464
Усяго па БССР	51063	3220	36340	9503

АДВАРОТНЫ БОК АДНЭЙ „ПЕРАМОГІ"

СЛУЦАК, 27. (Ад нашага карэспандэнта).

Сэрагоўскі сельсавет па тэмпах сяўбы ідзе ў раёне на самым першым месцы. За гэта сельсавет хвалілі. Раённыя арганізацыі заклікалі браць прыклад з Сэрагоўскага сельсавету, асабліва з калгасу **«ЧЫРВОНАЯ ГОРКА»**.

Гэты калгас першым яго толькі ў Сэрагоўскім сельсавеце, але і ва ўсім раёне скончыў сяўбу аўса. На 20 красавіка калгас «Чырвоная горка» засеяў пад авёс 193 гэктары. Плян выкананы поўнасьцю, **АЛЕ ЯК?** У пагоні за колькасьцю лёгкі злачынца інструкцыі якасьць.

У калгасе **ПАРУШАНЫ** элементарныя патрабаваньні агратэхнікі. Якасьць ворыва і сяўбы—нікуды ня варта. **30 ГЭКТ. АЎСА ЗАСЕЯНЫ Ў АДНАВОР.** Забаранаваці авёс абыяк — толькі-б хутчэй, рапартаваць аб «перамозе». Амаль увесь засеяны авёс ляжыць на версе. Насеньне пакінут ня прыкрыты зямлёй.

Мала таго. У калгасе ёсьць радковыя сяўлкі, а **УСЯ СЯЎБА АЎСА ПРАВЕДЗЕНА** ўрунтую. Сяўлкі стаяць без усякай нагрузкі.

Слуцкая партарганізацыя павінна зрабіць адказныя палітычныя высновы, рашуча ўмяшаўшы сваю пільнасьць да найменшых спроб падарваць урадкайнасьць колгасных палёў.

Кіраўнікі калгасу «Чырвоная горка», якія дапусьцілі злачынную апрацоўку глебы, павінны быць сурова пакараны.

Х.

НЕКАТОРЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАТЫ

1918 год. Краіна—асаджаны лягер. Клясавы вораг звонку і зьнутры імкнецца задушыць савецкую ўладу. Уладзімер Ільіч піша артыкул «Як арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва». Праз некалькі дзён пасьля ратыфікацыі мірнага дагавору **Ленін** піша чарговы другога артыкулу: **«Чарговыя задачы савецкай улады»**, дзе значнае месца аддаецца сацыялістычнаму спаборніцтву.

28 красавіка гэтага-ж году Уладзімер Ільіч у «Известиях ВЦИК» друкуе артыкул аб сацыялістычнай арганізацыі спаборніцтва, як «спосабу да бліцца павышэньня дысцыпліны працы, уменьня працаваць, хуткасьці, інтэнсіўнасьці працы лепшай яе арганізацыі».

1919 год. Вялікі пачын.

Пралетарыят, паўмарэнуты, паўгалодны гераічна адбівае клясавага ворага на франтах грамадзянскай вайны. Рабочыя ў тылу на сваёй уласнай ініцыятыве арганізуюць камуністычны суботнік. Ленін пісаў тады, што гэта ёсьць **«пачатак пераварота больш цяжкага, больш істотнага, больш ізрэзнага, больш рашаючага, чым зьвяржэньне буржуазіі, бо гэта— перамога над уласнай косьнасьцю, разбэшчанасьцю, дробна-буржуазным эгаізмам»**.

Сакавік і красавік 1920 году.

IX зьезд камуністычнай партыі кладзе ленінскія ідэі сацыялістычнага спаборніцтва ў аснову сваіх пастаноў па ўцягненьні шырокіх пралетарскіх мас у справу будаўніцтва сацыялізму, узьняцьця прадукцыйнасьці працы. Зьезд заклікае арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж раёнамі, заводамі, цэхамі, майстэрнямі і паасобнымі рабочымі.

1923-24 год.

Кінутае [illegible] найбольш панурай [illegible] рэакцыі, крывавага задушэньня рабочай клясы аб'яднанымі сіламі міжнароднага капіталу, прускага юнкерства, кайзэраўскай вастчыны і шалеючых мяшчан.

Прыклад Германіі — павучальны ўрок ня толькі для германскага, але і для ўсяго сусьветнага пралетарыяту. Фашызм ня мог-бы перамагчы ў Германіі, узмацняць свае пазыцыі ў Аўстрыі і ўздымаць галаву ў іншых краінах, калі-б сацыял-дэмакратыя ня выдала з галавой пралетарыят буржуазіі. Сённяшняе становішча ў Германіі, якое ідзе ўдарнікамі. Яны сапраўды гераічна, не шкадуючы часу і сіл, ліквідавалі прарывы.

Накацілася шырокая хваля арганізацыі ўдарных брыгад па ўсёй краіне Саветаў.

Лістапад 1928 году. Пленум Цэнтральнага Камітэту ў сваіх рэзалюцыях **«заклікае членаў партыі сканцэнтраваць усе свае сілы на прадасьленьне гаспадарчых труднасьцей, на мабілізацыі ўсіх творчых сіл рабочай клясы для таго, каб узятыя намі тэмпы індустрыялізацыі і калектывізацыі захаваць і намечаны гаспадарчы плян выканаць».**

У адказ на гэты кліч пралетары **Яруўскай** тэкстыльнай фабрыкі і фабрыкі **«Катушка»** арганізуюць сацыялістычнае спаборніцтва на лепшае правядзеньне выбораў у саветы.

Сьнежань 1928 году. Цэнтральны орган партыі **«Правда»** арганізуе ўсесаюзны агляд работы вытворчых камісій і вытворчых нарад.

20 студзеня 1929 году.

Увесь савецкі друк перадрукоўвае артыкул Уладзімера Ільіча Леніна **«Як арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва»**. 26 студзеня г. г. **«Комсомольская правда»** кідае кліч: **заводы, выходзьце на сацыялістычнае спаборніцтва па зьніжэньні сабекошту.** «Арганізуем усесаюзнае» сацыялістычнае спаборніцтва».

Сакавік 1929 году.

Ленінградзкія рабочыя заводу **«Красный выборжец»** прыслалі ў **«Правду»** адкрыты ліст, у якім яны выклікалі ўвесь пралетарскі калектыў Савецкага саюзу разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў справе ўзьняцьця прадукцыйнасьці, зьніжэньня сабекошту і ўмацаваньня працоўнай дысцыпліны.

Красавік 1929 году.

фашызму, [illegible] тэкстыльшчыкаў у го[illegible] бальшавізму, тым [illegible] першы дагавор жорсткай барацьбы за рынкі, [illegible]ваньне і пашырэньне ўласных пазыцый, у вельмі малой меры схільна задаволіць рэваншысцкія тэндэнцыі германскага імпэрыялізму. Перагляду граніц, роўнасьці ва ўзбраеньнях германскі фашызм можа дабіцца толькі шляхам вайны. Каб дабіцца якіх-небудзь уступак, ён гатоў уключыць Германію ў антыфашысцкі фронт.

Прыход да ўлады Гітлера выклікаў вялізарнае абвастрэньне ўсіх міжнародных супярэчнасьцяй, якія і так стычнае спаборніцтва, шырокія масы чырвонапуціліўцаў згуртаваліся вокал нымі радамі вакол асноўных вытворчых задач», —так рапартавалі чырвонапуціліўцы XVI партыйнай канфэрэнцыі.

Узмоцненай арганізацыяй ударных брыгад завяршыўся першы этап ленінскага сацыялістычнага спаборніцтва.

29 красавіка 1929 году—гістарычная дата гадавіны сацспаборніцтва. Пралетарыят уступае ў першую пяцігодку будаўніцтва сацыялізму.

XVI партыйная канфэрэнцыя публікуе адозву да рабочых і ўсіх працоўных мас Савецкага саюзу, заклікаючы іх на актыўнае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Гэта адозва яшчэ больш ускалыхнула шырокія колы пралетарскіх мас.

5 сьнежня 1929 году. Адкрыўся ў вялікай залі дому прафсаюзаў (Масква) першы ўсесаюзны зьезд ударнікаў. З трыбуны зьезду ўдарнікі гаварылі партыі аб тых «цудах», якіх яны тварылі на аснове ленінскага сацыялістычнага спаборніцтва. Падведзены першыя вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

1930 год—год новага этапу.

У красавіку на заводзе імя Карла Маркса ў Ленінградзе быў створан першы сустрэчны прамфінплян. Упяршыню «сустрэча» гаспадарчых арганізацый з рабочымі ў справе планаваньня адбылася непасрэдна ля варштата.

6 тысяч пралетараў праз «Правду» падзяліліся сваім першым вопытам у справе сустрэчнага прамфінпляну і выклікалі ўвесь рабочы калектыў пасьледаць іх прыкладу.

Верасень 1930 году.

Цэнтральны Камітэт усесаюзнай камуністычнай партыі выпускае адозву да ўсіх працоўных, што «сустрэчны прамфінплян набывае асаблівае значэньне, як мэтад сапраўднага ўцягненьня ўсіх рабочых у справу сацыялістычнага будаўніцтва і як важнейшы сродак барацьбы з контр-рэвалюцыйным [illegible]кодніцтвам».

Наша [illegible]-пракатчык **Шаўай** і зьменнае вялізарнае міжнароў (Марыўпальскі не. Яшчэ ў пачатку пяцігодкі варыў, што «зараз галоўнае — сустрэчуздзеянне на міжнародным рынку. Так дыю мы аказваем сваёй гаспадарцы са налітыкай». Перамогі сацыялізму [illegible] СССР набліжаюць урачыстасьць сусьветнай рэвалюцыі.

Няхай-жа жыве міжнародная пралетарская рэвалюцыя!

АДВАРОТНЫ БОК АДНЭЙ „ПЕРАМОГІ"

СЛУЦАК, 27. (Ад нашага карэспандэнта).

Сэрагоўскі сельсавет па тэмпах сяўбы ідзе ў раёне на самым першым месцы. За гэта сельсавет хвалілі. Раённыя арганізацыі заклікалі браць прыклад з Сэрагоўскага сельсавету, асабліва з калгасу **«ЧЫРВОНАЯ ГОРКА»**.

Гэты калгас першым яго толькі ў Сэрагоўскім сельсавеце, але і ва ўсім раёне скончыў сяўбу аўса. На 20 красавіка калгас «Чырвоная горка» засеяў пад авёс 193 гэктары. Плян выкананы поўнасьцю, **АЛЕ ЯК?** У пагоні за колькасьцю лёгкі злачынца інструкцыі якасьць.

У калгасе **ПАРУШАНЫ** элементарныя патрабаваньні агратэхнікі. Якасьць ворыва і сяўбы—нікуды ня варта. **30 ГЭКТ. АЎСА ЗАСЕЯНЫ Ў АДНАВОР.** Забаранаваці авёс абыяк — толькі-б хутчэй, рапартаваць аб «перамозе». Амаль увесь засеяны авёс ляжыць на версе. Насеньне пакінут ня прыкрыты зямлёй.

Мала таго. У калгасе ёсьць радковыя сяўлкі, а **УСЯ СЯЎБА АЎСА ПРАВЕДЗЕНА** ўрунтую. Сяўлкі стаяць без усякай нагрузкі.

Слуцкая партарганізацыя павінна зрабіць адказныя палітычныя высновы, рашуча ўмяшаўшы сваю пільнасьць да найменшых спроб падарваць урадкайнасьць колгасных палёў.

Кіраўнікі калгасу «Чырвоная горка», якія дапусьцілі злачынную апрацоўку глебы, павінны быць сурова пакараны.

Х.

ДВА СУСЕДЫ

Мы сёньня паказваем, як праходзяць палявыя работы ў двух калгасах аднаго і таго-ж сельсавету (Запольскі сельсавет, Рагачоўшчына).

Два суседы, родныя сілы, родныя магчымасьці, а наколькі адзін адстае ад другога!

У першым датэрмінова скончана сяўба раньніх яравых, у другім—толькі пачынаецца ворыва.

Прычына посьпеху калгасу „Шлях Леніна"—у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва на аснове добрай арганізацыі працы.

Прычына адставаньня яго суседа—у дрэннай працоўнай дысцыпліне, у няправільнай расстаноўцы сіл.

Калгасьнікі-ўдарнікі, адказвайце ня толькі за сябе! Перадавайце свой вопыт адстаючым, дамагайцеся, каб яны вышлі ў рады перадавікоў!

ЯК КАСЬЦЮШАНЦЫ АДСЕЯЛІСЯ

Невялікая вёска Касьцяны. Абапал пяшчанай вуліцы прылілла некалькі дзесяткаў хат. З іх 30 — хаты калгасьнікаў сельска-гаспадарчай арцелі «Шлях Леніна».

Гэтай вясной касьцяшанскія калгасьнікі адныя з першых у раёне прыступілі да сяўбы.

Суседзі кпілі з касьцюшанцаў. Пры сустрэчы старшыня суседняга калгасу імя Сталіна **АХРАМКОЎ** іранічна пытаў у старшыні калгасу «Шлях Леніна» **ТРЫСЬЦЯНЕЦКАГА:**

— Ну, як, хутка адсеешся? Тады ўжо можа і нам дапаможаш, га?

Трысьцянецкі моўчкі пераносіў кпіны і думаў: — «добра, пагледзім, што будзе»...

Да 20 красавіка суседзі прышлі з такімі разультатамі: калгас «Шлях Леніна» забаранаваў усё зазямленае поле, узараў 45 га, расьсеяў 115 цэнтнэраў фасфарытнай мукі, засеяў 10 га лубіну на насьценне, 10 га ячменю і 4½ га аўса.

А калгас імя Сталіна толькі... пачынаў ворыва.

20 красавіка Трысьцянецкі склікаў пасяджэньне праўленьня калгасу.

— Мы атрымалі тэлеграму т. т. Рікало і Галадзеда, партыя патрабуе, каб мы да 25 красавіка закончылі сяўбу аўса.

Сказаў і запытальна паглядзеў на брыгадзіра Апанаса.

— За 5 дзён?, — скептычна пацісьнуў плячыма брыгадзір.

— Не за 5, а за 3 — на яшчэ большае выдзіўленьне брыгадзіра ўпэўнена прагаварыў старшыня.

— Так, да 24 красавіка мы павінны скончыць сяўбу аўса, а 25-га — усіх збожжавых.

Рахункавод калгасу, рэдактар штодзенкі «За ўраджай» М. Восіпаў тут-жа зачытаў загадзя распрацаваны «плян ударнага завяршэньня сяўбы за 3 дні». Засталося засеяць: 18 га аўса, 7 га ячменю, 7 га вікі, ½ га пшаніцы, 5 гэктараў гароху і 6 га ільну.

Вечарам, калі брыгада вярнулася з поля, адбылася вытворчая парада. Па інфармацыі Трысьцянецкага загаралася заядлая спрэчка.

— Гаварыць яно ўсё можна, але вось папрабуй выканаць, — заявіў сейбіт Лявон Восіпаў.

— Праўду Лявон кажа, вышэй пупа не падскочыш — падтрымаў Лявона брыгадзір, які зноў вярнуўся да старой думкі, што нельга за 3 дні скончыць сяўбу.

— За тры дні мы, вядома, засеялі-б, але толькі тады, каб нормы выконваліся. А то, вось сёньня: 2 сявяркі засеялі толькі 4½ га замест 6 па норме, а на плуг ўзарана ўсяго па 0,5 га, а трэба 0,7 га — упарта даводзіў брыгадзір.

Трысьцянецкі ўмела і грунтоўна разьбіў аргументы скептыкаў. Нормы на выконваліся толькі таму, што брыгадзір дрэнна кіруе брыгадай. Усе плугі скопам працавалі, ад чго былі затрымкі, таўкатня ў балазьне. Таксама і сявяркі.

Большасьць калгасьнікаў падтрымала Трысьцянецкага.

Назаўтра ад світа ўсе ўжо былі на полі. Аратыя падзяліліся на два зьвены, па 4 плугі ў кожным. Сёньня ўпяршыню яны працуюць такім мэтадам і кажуць яідаць, што работа ідзе спарней. Без затрымак ходзяць плугі па доўгім палетку бульбянішча.

Кузьма Бабкоў кіруе першым зьвяном аратых. Ён сёньня выявіў свае здольнасьці. Расставіў плугароў адзін ад другога на вялікую адлегласьць. У аратага Міны спачатку пешта нарвіўся плуг і яму прышлося некалькі раз спыняцца. Але з-за гэтага ня спынялася работа ўсёй групы, бо пакуль над'яжджаў наступны араты, Міна выпраўляў недахопы і ехаў далей.

Бабкоў пільна сочыць за якасьцю апрацоўкі глебы. Вось ён заўважыў зроблены кімсьці агрэх. Ён хутка адлічыў (у Бабкова кожная скіба мае свайго гаспадара), агрэх прыхопіўся на Міколаў плуг.

— Ты што гэта ўсю нашу работу паганіш — са злосьцю накінуўся Бабкоў на Міколу. — зараз-жа выпраў, — паказваючы нугаўём на кавалак няўзьнятай цаліны.

Зьвеньні працуюць педалёка адно ад другога і паміж імі ідзе маўклівае, але заўзятае спаборніцтва.

Разьвёзшы насеньне, на поле з каробкай праз плячо прышоў і Трысьцянецкі. Старшыня калгасу намагаецца паказаць, што ён добры сейбіт. Шырока рассыпаючы насеньне віх Трысьцянецкі з кожным крокам надда тэмп руху. Дагнаўшы рахункавода, ён перавёў дух, змахнуўшы рукавом буйную кроплю пота.

— Што, запарыўся, таварыш старшыня — жартаўліва кінуў рахункавод.

— Ды, відаць, і табе трохі «лягчэй», чым у канцылярыі лынды біць — у тон адказаў Трысьцянецкі.

Але жартаваць ня было калі. Да поўдню было засеяна 7 га вікі. На кожнага работніка прышлося па 2,33 га. Норма была перавыкананая на 0,6 га.

У часе абедзенага перапынку Апанас абмеркаў зробленыя работы за поўдня і проста з поля прыбег у канцылярыю калгасу, дзе калгасьнікі разам з старшынёй праўленьня меркавалі, як паскорыць тэмп сяўбы. Апанас з захапленьнем далажыў разультаты паўдзённай работы.

— Сявяркі засеялі па паўтары га, аратыя ўзаралі па 0,35 га. Усе выканалі нормы.

— А ты-ж усё хныкаў, — папракнуў брыгадзіра рэдактар штодзенкі.

Разультаты першага штурмавога дня былі нечаканыя. Калі ўчора было ўзарана па 0,5 га на плуг, дык сёньня па 0,70 га. Учора адна сявярка засеяла 2,25 га, сёньня — 3. Гэта падбадзёрыла калгасьнікаў.

Трысьцянецкі упёс прапанову—заўтра закончыць сяўбу аўса, а не 23-га, як пастанавілі ўчора. Для гэтага нарашылі навычыць у суседнім калгасе яшчэ адну сявярку.

Пазаўтра 3 сявяркі засеялі 9 га аўса. Рэшта была засеяна ў раскід. Прыцемкам у глебу была кінута апошняя жменя насеньня аўса.

Прышоўшы з поля, рахункавод калгасу напісаў рапарт сельсавету — сяўба аўса скончана. Засеяна 25 га. Заўтра прыступаем да сяўбы ячменю, пшаніцы, гароху.

23—24 красавіка калгас скончыў сяўбу астатніх раньніх яравых.

З 25 красавіка ў калгасе разгарнулася барацьба за выкананьне ўзятага самаабавязацельства — да 1 мая засеяць 8 га раньняй бульбы і 6 га ільну.

П. ЧЫКУН.

РАГАЧОЎШЧЫНА,
калгас «ШЛЯХ ЛЕНІНА».

ЧАМУ ГЭКТАРЫ НАВАТ НЕУЗАРАНЫ

РАГАЧОЎ, 27. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Паляводчая брыгада калгасу імя Сталіна, Запольскага сельсавету, павінна засеяць 319 гэктараў яравых, у тым ліку 120 га збожжавых і 60 га бульбы. Першы раз брыгада выйшла ў поле 4 красавіка. На 20 красавіка за 16 дзён брыгадай узарана пад ячмень 16 гэктараў і забаранавала 17 га. Вось усё. Такім чынам, брыгада, а яна налічвае 67 працаздольных калгасьнікаў і мае 27 рабочых коняй, рыхтавала штодзенна толькі на адным гэктары.

З 16 дзён дасьць спрыялі палявым работам. Норма на аднаконны плуг 0,5 га. Брыгада мела магчымасьць пасылаць на ворыва штодзенна ня менш 10 коняй, або ўзараць па 5 гэктараў, а за 10 дзён—50 га. Чаму-ж 34 гэктары засталіся не ўзаранымі?

Вельмі проста—запрацаваўшы 4 красавіка у полі, брыгада робіць 7-дзённы перапынак і толькі 12 красавіка зноў выходзіць на ворыва. Прычым 4 красавіка на работу вышла толькі 14 чалавек, а 12-га — 10. Працоўная дысцыпліна на зусім у занядбане: хто калі хоча, та і працуе. А ў вынікдзень брыгада зноў прагуляла некалькі дзён.

20 красавіка надвор'е падзвычай сарыяла сяўбе. А 8 гадзіне раніцой на двары ля стайні калгасу сабралася невялікая кучка людзей. Яны чакалі брыгадзіра Качмарова. Калгасьнікі ня ведалі, што яны будуць сёньня рабіць.

Нарэшце, ім надакучыла чакаць. Адзін з калгасьнікаў прыпомніў, вёды Качмароў гаварыў, што брыгада сёньня пойдзе араць. Усе узяліся за плугі, але ў гэту хвіліну на двор прышоў другі калгасьнік і заявіў, што старшыня калгасу Ахрамкоў зарадзіў базіць гной. Настрыпка зменшаньне, пачаліся спрэчкі. Шмат хто зусім кінуў работу і сеў пакурыць. Нарэшце, — праз дзве гадзіны—зьявіўся Ахрамкоў і вызначыў калгасьнікам работу.

Брыгадзір Качмароў у гэты час працаваў у сьвірне: ён важыў мяса, перасыпаў насеньне. Фактычна Качмароў не брыгадзір, а кладаўшчык. На полі ён бывае выпадкова, выключна для таго, каб абмераць узараную або забаранаваную плошчу.

Ня гледзячы на добрае надвор'е, Ахрамкоў накіраваў на ворыва толькі 9 чалавек, а астатніх—на вывазку гною. За дзень было ўзарана 2,5 гэктары.

Напярэдадні Ахрамкоў на сходзе партыйнай ячэйкі гладзеваў за тое, каб 25 красавіка засеяць увесь авёс. Праглаасаваў і... забыў. На ворыва глебы пад авёс не навіравалі ні аднаго плуга. Засталося 5 дзён. З 45 га, вызначаных пад авёс, ні адзін ня ўзоран. Але Ахрамкова гэта ніколькі ня турбуе, таксама як і сакратары партыйнай Каморнікава і ўпаўнаважанага райкому Рабіновіча.

Ад канцылярыі сельсавету да поля калгасу імя Сталіна 200 крокаў. Аднак, ні Каморнікаў, ні Рабіновіч на калгасным полі ні разу ня былі і што там робіцца ня ведаюць.

А там—на палёх — агрэх за агрэхам.

За якасьцю работы ніхто ня сочыць, ніхто не кантролюе. Брыгадзір толькі абмярае ўзараную плошчу.

Нарэшце, аб арганізацыі самой брыгады. Фактычна гэта ня брыгада, а натоўп людзей. У калгасе 50 гаспадарак. Можна і трэба было разьбіць калгасьнікаў на дзве брыгады, вызначыць кожнай брыгадзе адказедны вучастак у полі сеязвароту і г. д. Тут-жа гэтага няма. Усе 67 чалавек працуюць у адной брыгадзе.

Чаму-ж гэктары нават не ўзараны? Ясна. Справа ў кіраўніках калгасу, якія сабатуюць сяўбу. Справа ў нікуды ня вартай арганізацыі працы. Справа ў тым, што ў калгасе цацкаюцца з гультаём.

П. Ч.

ПРА НАДВОР'Е І САПРАЎДНАСЬЦЬ

МАГІЛЕЎ, 27.

— У нас усё падрыхтавана да сяўбы, перашкаджае толькі надвор'е, — так заявіў на апошнім пасяджэньні райвасьвіскому сакратар раённага камітэту партыі тав. **КАЛОДКА.**

Такую думку мае ня толькі тав. Калодка, а і ўсё раённае кіраўніцтва.

Як-жа на справе?

Магілеўшчына да 25 красавіка павінна была засеяць 16.000 гэктараў аўса.

З першых дзён палявых работ калгасы раёну ўзаралі 937 га, аднаасобнікі 20,5 га, засеялі-ж усяго 26 гэктараў — 0,2 проц. пляну.

Праўда, былі некалькі дзён, калі сапраўды перапрацавалі работам у полі. Але з 20 на 25 красавіка надвор'е зусім спрыяла разгортваньню сяўбы.

Якія-ж вынікі першых дзён работы ў полі. Спынімся на калгасе «Чырвоная зорка», В.-Бялевіцкага сельсавету. Тут дзьве паляводчыя брыгады, у кожнай па 46 чалавек. 12 красавіка калгас выйшаў у поле. У брыгадзе Канаўлёва ў першы дзень з 46 чалавек выйшлі на работу толькі 16. На 16 конях узарана 5 га замест 8 паводле пляну.

13 красавіка ў гэтай-жа брыгадзе вышла на работу ўжо ўсяго 15 калгасьнікаў. За дзень на 15 конях узарана 4,75 га. 14 красавіка вышла на работу 10 чалавек, узарана 2 га.

Праўленьне калгасу вызначыла яўна зьменшаныя нормы выпрацоўкі. Замест 0,6 га на ворыве вызначана 0,33 га ў першы раз і 0,24 га ў другі раз. Такія-ж зьменшаныя нормы і на баранаваньні, вывазцы гною і іншых відах работ.

Якасьць ворыва ніхто не правяраў, таксама як і спалучасовы выхад на работу.

Выхад на работы ў калгасах Магілеўшчыны пачынае прымаць сур'ёзны характар: напрыклад, у калгасе «Чырвоны барацьбіт» замест вызначаных на пароду 8 чал., вышла толькі 3 і то а 10 гадзіне раніцы. У поле-ж выехалі а 12 гадзіне, 2 гадзіны пры калгасным рыхтавалі калёсы, плугі і г. д. За дзень узаралі 0,5 га.

Аб усіх гэтых грубейшых шамыках, дапушчаных калгасамі ў першыя дні сяўбы, раённыя арганізацыі і ў прывілейнасьці райземаддзел ня маюць ніякага ўяўленьня. За апошнюю дэкаду ніхто з раённых кіраўнікоў у калгасах ня быў.

Ходам палявых работ, правільнай арганізацыяй работай сілы на полі ніхто ня кіруе.

Раённы камітэт партыі і райвасьвіскому павінны бесаканцэрна выкрываць дапушчаныя шамыкі, дамагчыся калгасам прыйшла арганізаваць работу на палёх, устанавіць бальшавіцкую дысцыпліну ў брыгадах.

НЭЙДЛІН

„ЭМБАРГО—ПАЛКА З ДВУМА КАНЦАМІ“

Заява германскай газэты

БЭРЛІН, 27. У сувязі з уступленьнем у сілу ангельскага закону аб забароне ўвозу савецкіх тавараў у Англію, лёндонскі карэспандэнт «Франкфуртэр Цайтунг» піша: «Гэта забарона зьяўляецца палкай з двума канцамі. Адсутнасьць савецкай нафты можа, напрыклад, выклікаць нешкодзі у галіне пэн на ангельскім рынку бэнзыны. Савецкі лес, праўда, можна замяніць скандынаўскім, або канадзкім, але па значна больш высокіх цэнах».

* * *

ЛЁНДАН, 26. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Канбэры, аўстралійскі прэм'ер Лайонс заявіў у палаце прадстаўнікоў, што ангельская пастанова аб дастасаваньні эмбаргі на савецкія тавары не пашыраецца па Аўстралію.

Вашынгтонскія перагаворы закончыліся нічым

ГЮ-ЕРК, 27. (БЕЛТА). Макдональд выехаў назад у Англію, пакінуўшы ў Вашынгтоне некалькіх фінансавых экспэртаў для вядзеньня далейшых перагавораў.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку Макдональд выказаў задавальненьне з поваду сустрэчы з Рузвэльтам, але заявіў, што згода не дасягнута. Паводле слоў Макдональда, ён выяжджае з Вашынгтону, «думаючы, што мы павінны дасягнуць згоды і нарэшце гэта зрабіць».

У апублікаванай Рузвэльтам і Макдональдам сумеснай заяве гаворыцца: «Наша абмеркаваньне ня мела на мэце заключэньня пэўных згод, што павінна быць прадастаўлена сусьветнай канфэрэнцыі». Далей указваецца, што ўзятыя пад аналіз прапановы будуць абмяркоўвацца прадстаўнікамі іншых краін, запрошанымі ў Вашынгтон з мэтай забясьпечыць у найлепшай ступені агульную згоду да скліканьня эканамічнай канфэрэнцыі. Абодва ўрады спадзяюцца на магчымасьць скліканьня канфэрэнцыі ў чэрвені.

* * *

ЖЭНЭВА, 27. (БЕЛТА). Вэлінгтон Ку сьпешна выехаў у Вашынгтон, дзе спаткаецца з міністрам фінансаў Суп Цзэ-вэнам. Як перадаюць, кітайскія прадстаўнікі маюць намер паставіць перад Рузвэльтам япона-кітайскае пытаньне ў поўным аб'ёме.

За кулісамі фашысцкага лягеру

БЭРЛІН, 27. (Белта). Загадам першага старшыні «сталёвага шлёму» міністра працы ЗЭЛЬДТЭ, другі старшыня «сталёвага шлёму» падкрэсьлівае, што яго прымусілі адмовіцца ад усякай дзейнасьці ў «сталёвым шлёме». Дзюстэрбэрг у разьвітальным лісьце да «сталёвага шлёму» падкрэсьлівае, што яго прымусілі адмовіцца ад усякай дзейнасьці ў «сталёвым шлёме».

У афіцыяльным паведамленьні кіраўніцтва «сталёвага шлёму» гаворыцца, што ў інтарэсах «адзінства ў кіраўніцтве і згуртаванасьці ў дзеяньнях «сталёвага шлёму» першы старшыня яго Зэльдтэ парашыў узяць у свае рукі ўсё кіраўніцтва «сталёвым шлёмам».

Сапраўдная прычына звальненьня Дзюстэрбэрга са «сталёвага шлёму» ў тым, што Дзюстэрбэрг, як найбольш папулярны кіраўнік «сталёвага шлёму», які асабліва энэргічна змагаўся за самастойнасьць яго, быў ненавісным для нацыянал-сацыялістаў, якія ўвесь час дамагаліся адхіленьня яго ад кіраўніцтва «сталёвым шлёмам».

Орган партыі цэнтру «ГЕРМАНІЯ» піша: «Грубае па форме адхіленьне Дзюстэрбэрга — рэзультат сур'ёзных разгалосьсяў паміж ім і Зэльдтэ».

Масавыя пратэсты ангельскіх рабочых супроць эмбарго

ЛЁНДАН, 26. (БЕЛТА). Рабочыя прымаюць рэзалюцыі пратэсту супроць эмбарго на савецкія тавары. Рэзалюцыі пратэсту прынялі аддзел прафсаюзаў маляроў у Эбэрдынгу, мэбельшчыкі ў Лёндане, прафсавет у Дарэме, масавы мітынг рыбакоў у Пытэрхэдзе, канфэрэнцыя таварыства прыяцеляў СССР у Шэфільдзе, масавыя рабочыя мітынгі ў Шэфільдзе і Фолхэме.

Стварыць у кожным калгасе баявое ядро савецкага актыву

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклады Вушацкага, Камарынскага і Мсьціслаўскага РВК, а таксама Высока-Жэраўскага сельсавету, Мсьціслаўскага раёну, па пытаньні аб разгортваньні масавай работы саветаў у галіне падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы.

У сваёй пастанове ЦВК адзначыў, што з прычыны недаацэнкі вышэйуказанымі РВК і большасьцю сельсаветаў гэтых раёнаў масавай работы саветаў, сэкцый, дэпутацкіх груп і з-за адсутнасьці выразнага разьмеркаваньня абавязкаў паміж асобнымі членамі сельсавету—падрыхтоўка да веснавой сяўбы ідзе нездавальняюча. Аб гэтым сьведчыць тое, што яшчэ да апошняга часу ня скончан рамонт трактараў, сельска-гаспадарчага інвэнтару, складаньне вытворчых плянаў, фармаваньне пастаянных брыгад, ачыстка і ссыпка насеньня і страхавых фондаў.

ЦВК падкрэсьліў, што сельска-гаспадарчыя вытворчыя сэкцыі сельсаветаў амаль не працуюць і ня прыняты крокі для афармленьня дэпутацкіх груп у саўгасах і калгасах, а райвыканкомы і рад сельсаветаў падмяняюць масавую работу голым адміністраваньнем.

Зусім нездавальняюча пастаўлена работа сельсаветаў па замацаваньні на пастаяннай практычнай рабоце вызначанага актыву з лепшых калгасьніка, калгасьніц, ударнікаў і ў першую чаргу, удзельнікаў усебеларускага і ўсесаюзнага зьезду.

Да апошняга часу райвыканкомы і сельскія саветы слаба скарыстоўваюць у сваёй рабоце на падрыхтоўцы да веснавой сяўбы пастанову ўраду аб абавязковай здачы сельска-гаспадарчых прадуктаў дзяржаве, адозву ўсесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў і прамову тав. Сталіна на ўсесаюзным зьезьдзе. Слаба распрацаваны сярод шырокіх мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў пастановы III і IV сэсіі ЦВК Саюзу ССР і БССР аб умацаваньні калгасаў.

У гэтых раёнах і сельсаветах зусім нездавальняюча абслугоўваюцца аднаасобныя бядняцка-сярэдняцкія гаспадаркі ў галіне іх падрыхтоўкі да сяўбы, адсутнічае канкрэтнае кіраўніцтва з боку РВК і сельсаветаў спрадвечнай прыёму ў калгасы.

Райвыканкомы і Высока-Жэраўскі сельсавет не забясьпечылі штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва паасобнымі вучасткамі работы, не паладзілі кантролю і праверкі выкананьня сваіх дырэктыў зямельнымі органамі, МТС і калгасамі.

У сваёй пастанове прэзыдыум ЦВК указаў вышэйпералічаным РВК і сельсаветам, што «падмена масавай работы голым адміністраваньнем ёсьць простае скажэньне лініі партыі і што работа райвыканкому і сельсавету будзе ацэньвацца ня толькі па выкананьні мерапрыемстваў, а па пастаноўцы масавай работы ў раёне, сельсавеце, сэкцыі і дэпутацкіх групах».

Прапанавана Вушацкаму, Камарынскаму і Мсьціслаўскаму райвыканкомам зараз-жа арганізаваць і афармініць пры сельсаветах сэкцыі і стварыць дэпутацкія групы пры саўгасах, МТС.

На працягу красавіка райвыканкомы і гарсаветы павінны заслухаць на прэзыдыуме даклады асобных старшынь сельсаветаў аб разгортваньні масавай работы і кіраўніцтве сэкцыямі і дэпутацкімі групамі. ЦВК абавязаў усе сельсаветы забясьпечыць стварэньне ў кожным калгасе, калгаснай брыгадзе баявога ядра савецкага актыву, апіраючыся на які сельсаветы змогуць канкрэтна кіраваць ходам сяўбы і своячасова выпраўляць на хаду недахопы ў паливых работах.

Асаблівую ўвагу ЦВК БССР прапанаваў зьвярнуць на падрыхтоўку да сяўбы аднаасобнага сэктару, безадкладна забясьпечыць адвод зямель, ссыпку і ачыстку страхавых фондаў, рамонт інвэнтару, збор насеньня і пад піску да яго захаваньні.

Побач з арганізацыйнымі мерапрыемствамі і аказаньнем практычнай дапамогі працоўным аднаасобнікам у падрыхтоўцы да сяўбы, райвыканкомы, сельсаветы і органы юстыцыі павінны ўзмацніць барацьбу з праяўленьнямі кулацкага сабатажу.

Адзначыўшы зусім слабую работу Вушацкага, Камарынскага і Мсьціслаўскага РВК у падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў, прэзыдыум ЦВК прапанаваў:

а) арганізаваць і правесьці ў пэрыяд паміжнапар'я раённыя курсы савецкага актыву жанчын, членаў сельскіх саветаў;

б) забясьпечыць пасылку на цэнтральныя курсы на падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы работнікаў сельсавету лепшых і праверэных на практычнай рабоце калгасьнікаў і калгасьніц-ударнікаў;

в) вылучыць з ліку праверэных на ударнай рабоце ў калгасах і ў часе загатовак лепшых калгасьнікаў-ударнікаў на практычную работу ў апараты РВК, райза, іншыя раённыя арганізацыі і сельсаветы, аказаўшы вылучаным максымальную дапамогу ў асваеньні работы, зьвярнуўшы пры гэтым асаблівую ўвагу на вылучэньне жанчын калгасьніц-удзельніц усесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў.

Тэлеграма адэскага абкому КП(б)У

Ад сакратара адэскага абкому КП(б)У тав. ВЭГЕРА атрымана тэлеграма, у якой адэскі абком выносіць падзяку бальшавікам, камсамольцам і калгасьнікам РАСОНСКАГА, ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА, ЛЁЗЬНЯНСКАГА і ПЛЕШЧАНІЦКАГА раёнаў за аказаную дапамогу насеньнем бульбы прыгарадным гаспадаркам Адэскай вобласьці.

Усім старшыням РайКК-РСІ

29 красавіка ў 10 гадзін вечара адбудзецца радыё-парада старшынь райКК-РСІ па пытаньні веснавой сяўбы. На парадзе будзе дана слова для інфармацыі аб ходзе сяўбы ў раёне і аб рабоце КК-РСІ ў сувязі з сяўбой старшыням КК-РСІ наступных раёнаў: Слуцкага, Пухавіцкага, Клімавіцкага, Гарадоцкага, Горацкага, Дрысенскага, Віцебскага, Рэчыцкага, Жлобінскага і Рагачоўскага.

Астатнія старшыні павінны прымаць удзел у парадзе без выступленьня.

ЦКК-НК РСІ Бел. прапануе арганізаваць калектыўнае слуханьне радыё-парады актывам РСІ.

Старшыня ЦКК КП(б)Б
Нарком РСІ БССР ЛЫЧОЎ.

30 красавіка, роўна ў 7 гадз. веч., у памяшканьні **Яўрэйскага Дзяржаўнага Тэатру** (б. кіно „КУЛЬТУРА“)

адбудзецца

ўрачыстае пасяджэньне пленуму Гарсавету

сумесна з прадстаўнікамі партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый,

ПРЫСЬВЕЧАНАЕ 1 МАЯ.

Члены ЦК КП(б)Б, ЦКК і ГКК, ЦВК СНК, ЦК і ГК ЛКСМБ ЦСПСВ і ГСПС, члены гарсавету—праходзяць па сваіх мандатах.

Білеты па прадпрыемствах разьмяркоўвае ГСПС.

Прэзыдыум Менгарсавету.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Напярэдадні першамайскага сьвята

*** ЦП саюзу работнікаў мастацтва Беларусі арганізаваў 15 БРЫГАД ДЛЯ МАСТАЦКАГА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ РАЁНАЎ І ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ў дні ПЕРШАМАЙСКАГА СЬВЯТА. Кожны тэатральны калектыў і музыкальны тэхнікум абслужыць па 3 раёны.**

*** У сувязі з надыходзячым першамайскім сьвятам Аўтадор праводзіць КАНФЭРЭНЦЫІ АЎТАДОРАЎЦАЎ.**

*** Менскі, Бабруйскі, Гомельскі, Мазырскі, Полацкі, Слуцкі і Аршанскі саветы Аўтадору арганізуюць спэцыяльныя АЎТААГІТПРАБЕГІ для праверкі ходу падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і першамайскага сьвята. Аўтадораўскія арганізацыі ўключаюцца ў конкурс на лепшага трактарыста.**

*** Для ўдзелу ў першамайскім сьвяце цэнтральная камісія Менску ЗАПРАСІЛА ДЭЛЕГАЦЫЮ МАСКОЎСКІХ РАБОЧЫХ. Адначасова камісія накіроўвае у Маскву дэлегацыю з 30 лепшых менскіх ударнікаў.**

*** Наркамат аховы здароўя адзначае першамайскае сьвята арганізацыяй раду новых культурна-бытавых устаноў, асабліва ў раёнах. У Віцебску адкрываюцца жактаўскія ясьлі. Будзе абвешчан двухтыднёвік чыстаты ва ўсіх мэдустановах, інтэрнатах і прадпрыемствах грамадзкага харчаваньня. Разгортваецца сетка перасовачных санітарных выставак.**

У часе першамайскіх дэманстрацый у Менску, Гомелі і Віцебску арганізуюцца ПУНКТЫ ПЕРШАЙ ДАПАМОГІ І САНІТАРНЫЯ ВЫСТАЎКІ на аўтамабілях.

1-га мая адкрываюцца: дзіцячы корпус пры Мэгілеўскай псыхалячэбніцы на 50 ложак з санаторным аддзяленьнем, больнічны вучастак у Дрысе, доктарскі пункт у Ветрыне, дзіцячая кансультацыя ў Заслаўі, амбуляторыі ў Вузьдзе, Бярэзіне, раённая больніца ў Дзяржынску, рабочая больніца ў Старых Дарогах, інтэрнат для студэнтаў мэдінстытуту ў Менску і г. д.

Калектыўнае разучваньне сьпеваў да першамайскай дэманстрацыі на заводзе імя Варашылава (Менск).

Забясьпечыць бесьперабойнасьць пагрузачна-разгрузачных работ

Прэзыдыум ЦСПСБ абавязаў прафарганізацыі забясьпечыць у дні 1-га і 2-га мая бесьперабойную работу на чыгуначных станцыях і тэрміновае прасоўваньне пасажырскіх грузаў. Для гэтай мэты ўстанаўліваецца круглагадзінная нагрузка, выгрузка вагонаў і вывазка грузаў з пакгаўзаў. ЦП саюзу шофэраў павінна забясьпечыць падрыхтаванасьць транспартна-перавозачных сродкаў для поўнай адгрузкі і вывазкі з чыгуначных складаў усіх грузаў.

Будуць таксама арганізаваны першамайскія суботнікі па ачыстцы таварных дваро́ў, пакгаўзаў, чыгуначных станцый ад бруду, хламу і прыбраньню іх у поўны парадак.

Адкрыцьцё дамоў адпачынку

3-га мая ў Менску, Гомелі, Воршы, Віцебску і іншых гарадох БССР адкрываецца 11 дамоў адпачынку Галоўсан страху. На працягу летняга сэзону будзе прапушчана 26.500 чалавек. Тры дамы адпачынку адкрываюцца для рабочай моладзі.

Сёлета пачнецца будаўніцтва новага вялікага дому адпачынку ў Віцебску, на што асігнавана 1 млн. рублёў. Работы будуць весьціся з такім разьлікам, каб частова здаць яго ў эксплёатацыю ўжо ў бягучым годзе.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Аддзел кадраў ЦК КП(б)Б выклікае 29 красавіка усіх былых прадкамісараў і прадработнікаў — камуністаў, якія пражываюць у г. Менску.

АДДЗЕЛ КАДРАЎ ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Напярэдадні 1 мая за мяжой

Адзіным рэвалюцыйным фронтам супроць наступленьня капіталу і фашызму

Польшча

ВАРШАВА, 27. (Белта). На гледзячы на масавыя перадмайскія арышты, у Варшаве і іншых гарадох Польшчы адбываюцца шматлікія мітынгі і дэманстрацыі. 26 красавіка група рэвалюцыйных рабочых арганізавала мітынг каля будынку савету міністраў у Варшаве. У масоўцы, нападжанай 27 красавіка перад заводам «ПАРАВОЗ», прымала ўдзел звыш 350 рабочых. Другая масоўка адбылася перад заводам авіяцыйных матораў «ШКОДА» пры ўдзеле 500 рабочых. Масоўкі адбыліся таксама перад фабрыкамі «ПОЦІСК» і «ЛІЛЬПОП». На ўсіх гэтых масоўках выступаў камдэпутат РОЖЭК.

26 красавіка ў ЛОДЗІ на пляцы Волі перад беспрацоўнымі, якія там сабраліся, выступіў з прамоваю камуністычны дэпутат РОЗЭНБЭРГ. 600 беспрацоўных у ТАМАШОВЕ-МАЗАВЕЦКІМ (Лодзінскае ваяводзтва) дэманстравалі пад лёзунгам «патрабуем работы і хлеба». У той-жа дзень у ТАМАШОВЕ адбылася рабочая масоўка перад фабрыкай штучнага шоўку, на якой выступіў камдэпутат Роэзнбэрг.

У КАЛІШЫ паліцыя зрабіла масавыя вобыскі і арышты. Арыштавана 40 чал.

Чэхаславакія

ПРАГА, 27. (Белта). Зварот ЦК кампартыі Чэхаславакіі аб аб'ядныных з рэфармісцкімі рабочымі арганізацыямі першамайскіх дэманстрацыях сустрэў у шырокіх рабочых масах жывы водгук. Ва ўсёй краіне праходзяць сумесныя сходы камуністычных, рэфармісцкіх і неарганізаваных рабочых, на якіх прымаюцца рэзалюцыі камуністаў аб сумесных выступленьнях першага мая.

У кампартыю ўступіла 9.351 новых членаў. У асноўным рост адбываецца ў буйных прамысловых цэнтрах.

Баўгарыя

ВЕНА, 26. (Белта). Падрыхтоўка рэвалюцыйных рабочых арганізацый у Баўгарыі да першага мая праходзіць пад знакам арганізацыі масавага пратэсту супроць роспуску рабочай партыі, які падрыхтоўваецца ўрадам і супроць рэпрэсій, накіраваных супроць рабочай клясы. Баўгарскі ўрад адказаў на гэту падрыхтоўку забаронаю сходаў першага мая.

Швэйцарыя

ВЕНА, 26. (Белта). Пасьля рашэньня ЦК швэйцарскай сацыялістычнай партыі парваць сувязь са сваёй жанэўскай арганізацыяй, апошняя адмовілася ад свайго ранейшага рашэньня аб правядзеньні сумеснай першамайскай дэманстрацыі з кампартыяй, растлумачыўшы гэты крок «каданьнем уніякуць расколу сацыялістычнай партыі». Рашэньне кіраўніцтва швэйцарскай партыі выклікала нездавальненьне сярод жанэўскіх сацыялістычных рабочых, большасьць якіх стаіць за супольныя дэманстрацыі камуністычных і сацыялістычных рабочых.

ЦК швэйцарскай кампартыі зьвярнуўся да сацыялістычных рабочых з заклікам першага мая дэманстраваць наперакор сабатажу кіраўніцтву сацыялістычнай партыі сумесна з камуністычнымі рабочымі, пад лёзунгамі барацьбы супроць голаду, фашызму і ваеннай небясьпекі.

Аўстрыя

ВЕНА, 27. (Белта). У сувязі з каліжэньнем першага мая, зроблены вобыскі і арыштаван рад відных работнікаў кампартыі. Сярод арыштаваных рэдактар цэнтральнага органу аўстрыйскай кампартыі «РОТЭ ФАНЭ» — ШУЛЕР.

Пад націскам рабочых мас, патрабуючых правесьці, наперакор забароне паліцыі, першамайскую дэманстрацыю на цэнтральных бульварах, сацыял-дэмакратычныя правадыры адмовіліся ад першапачатковага пляну абмежавацца вырашаным паліцыяй спорт-сьвятам у стадыёне. Сацыял-дэмакратыя ў выпушчанай і ўжо канфіскаванай адозве, заклікае арганізаваць 1 мая па бульварах «мірную прагулку».

Францыя

ПАРЫЖ, 27. (ТАСС). Узмацняецца цяга рэфармісцкіх і сацыялістычных рабочых да адзінага фронту на першамайскіх дэманстрацыях, наперакор мэнэўрам і адкрытаму супраціўленьню підэраў. «Юманітэ» піша, што ў 40 гарадох Францыі адбыліся агульныя антыфашысцкія мітынгі і дэманстрацыі.

Англія

ЛЁНДАН, 28. Існуючы многа год лёнданскі «камітэт першага мая» разьвівае ўзмоцненую актыўнасьць для прыцягненьня шырокіх мас у першамайскія дэманстрацыі. Апошнія гады генсавет трэд'юніёнаў і лейбарысцкая партыя сабатавалі работу камітэту. Зараз яны назначылі дэманстрацыі 7 мая, бо першае мая прыходзіцца на рабочы дзень. У гэтым годзе ў Лёндане чакаецца вялікая дэманстрацыя. У радзе раёнаў Лёндану ня будуць працавацьгарадзкія служачыя, з прычыны іх удзелу ў першамайскай дэманстрацыі ў Гайдпарку. Спэцыяльныя атрады рабочых будуць дэманстраваць у газавых масках, каб напомніць аб жахах будучай вайны. У вялікай колькасьці распаўсюджваюцца першамайскія лістоўкі.

ПАЗШ

Н'Ю-ЁРК, 27. (Белта). Камітэты адзінага фронту ў Н'Ю-ЁРКУ і ў іншых гарадох, як гледзячы на сабатаж сацыял-дэмакратычных бюракратаў, якія адхілілі прапанову аб сумесных дзеяньнях, энэргічна рыхтуюцца да «першамайскіх дэманстрацый. Сакратар Н'ЮЁркскай арганізацыі сацыялістаў ГЕРБЭР зьвярнуўся да паліцыі з просьбаю не дапускаць камуністаў і рэвалюцыйных рабочых на «ЮНІЁН-СКВЭР» (традыцыйны цэнтр дэманстрацый у дзень першага мая) і аддаць «Юніён-сквэр» выключна ў распараджэньне сацыялістаў, «якія заўсёды супрацоўнічалі з паліцыяй».

Ня гледзячы на тое, што сацыялісты і бюракраты амэрыканскай фэдэрацыі працы ўсімі сіламі стараюцца сарваць аб'яднаныя выступленьні, многія сацыялісты і члены амэрыканскай фэдэрацыі працы і некаторыя мясцовыя арганізацыі фэдэрацыі прымаюць удзел у барацьбе пад лёзунгам адзінага фронту.

Японія

ТОКІЁ, 26. (Белта). У рабочых цэнтрах Японіі ідзе энэргічная падрыхтоўка да першага мая. Ня гледзячы на моцную агітацыю рэакцыянэраў, якія дабіваюцца арганізацыі патрыятычнай дэманстрацыі 29 красавіка замест першага мая, паступаюць паведамленьні аб падрыхтоўцы да першамайскіх дэманстрацый нават у далёкіх прамысловых цэнтрах і раёнах, дзе раней першамайскія дэманстрацыі не наладжваліся. Левыя саюзы ТОКІЁ, АСАКА і КОБЭ высоўваюць лёзунгі адзінага фронту барацьбы супроць фашызму і вайны. Лідэры сацыял-фашысцкіх саюзаў Садамэй процідзейнічаюць правядзеньню адзінага фронту; упяршыню ў гэтым годзе яны адмовіліся ад сумеснай дэманстрацыі з саюзамі, якія не ўваходзяць у Садамэй.

Фашысцкі паход супроць вучоных

БЭРЛІН, 27. (БЕЛТА). Звольнена 37 прафэсароў і дацэнтаў прускіх ВНУ, сярод іх прафэсар берлінскай кансэрваторыі, сусьветна вядомы піяніст Леонід Крэйцэр.

„Падпальшчыкаў рэйхстагу трэба шукаць у складзе ураду“

БЭРЛІН, 27. (ТАСС). Надрукаваны ў ангельскай ліберальнай газэце «Манчэстар гардыян» артыкул, у якім пацьвярджаецца, што падпальшчыкаў рэйхстагу трэба шукаць у складзе германскага ўраду, зрабіў ў берлінскіх колах моцнае ўражаньне.

Ва ўрадавых колах заяўляюць, што «падобны дакор па адрасу ўраду, які знаходзіцца ў сяброўскіх адносінах з Англіяй, зьяўляецца бяспрыкладным у гісторыі культурных нацый.

Германскі ўрад заявіў ангельскаму ўраду рэзкі пратэст супроць апублікаваньня ў ангельскім друку падобных артыкулаў аб Германіі.

Аўстрыйская першамайская дэлегацыя едзе ў Маскву

ВЕНА, 27. У Маскву выяжджае першамайская дэлегацыя аўстрыйскіх рабочых у складзе: 23 сацыял-дэмакратаў, двух камуністаў і прадстаўніка чырвоных фізкультурнікаў.

ВЫБАРЫ НОВАГА ПРЭЗЫДЭНТА У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 27. (Белта). Польская агенцтва паведамляе, што першага мая зьбярэцца нацыянальны сход, на якім будзе выбран новы прэзыдэнт Польшчы. Тэрмін паўнамоцтваў цяперашняга прэзыдэнта Масьціцкага канчаецца 5 чэрвеня.

Голад і галеча ў вёсках Зах. Беларусі

Сяляне пухнуць з голаду

Абвастрэньне эканамічнага крызісу ў Польшчы прывяло да поўнага разбурэньня сялянскай гаспадаркі. Шырокія масы працоўнага сялянства знаходзяцца ў крайняй нэндзы. Нават фашысцкі друк ня можа абыйсьці моўчкі таго жудаснага становішча, у якім апынуліся сялянскія гаспадаркі.

Вось як «Газэта Варшаўска» апісвае становішча сялян у Палескім ваяводзтве:

«Гаспадарчае становішча Палесься пагаршаецца з дня на дзень. У найбольш жудасным становішчы апынуліся палескія сяляне, асабліва ў Столінскім павеце. Ёсьць вёскі, у якіх насельніцтва, замучанае голадам, тыфусам, харчуецца хлебам з бярозавай кары і іншых суррагатаў, у якіх знойдзеш усё, апрача мукі. Так жывуць дзесяткі-тысячы сялян, якія даўно ня маюць хлеба і іншых прадуктаў».

Газэта паведамляе, што ў Столінскі павет выехала ратавальная экспэдыцыя, якая наведае вёскі, дзе сяляне ляжаць упокат спухшыя ад голаду.

Ня менш жудаснае становішча ў Віленскім ваяводзтве. «На ўсходніх Украіны,—піша газэта,—прыбываюць вялікія масы беспрацоўных з Лодзінскага, Келецкага і Варшаўскага ваяводзтваў. Нярэдка можна сустрэць беспрацоўных з Серхняй Сілезіі і Памор'я. У большасьці гэта—кваліфікаваныя рабочыя».

Забойствы і катаваньні не задушаць рэвалюцыйнага руху

Гераічная КПГ працягвае барацьбу з фашызмам

СТАКГОЛЬМ, 27. (Белта). Берлінскі карэспандэнт «СТОКГОЛЬМС ТЫДНІНГЕН» паведамляе, што ў той час, як германская сацыял-дэмакратыя фактычна бязьдзейнічае, германская кампартыя, ня гледзячы на фашысцкі тэрор, праводзіць рэвалюцыйную барацьбу, ужываючы розныя мэтады работы. Карэспандэнт піша: «Камуністы стварылі свой працаздольны апарат і могуць працягваць падпольную агітацыю. Часта можна знайсьці ў сваёй скрынцы лістоў разам з легальнымі газэтамі экзэмпляр «РОТЭ ФАНЭ», якая па-ранейшаму выходзіць на 4-х старонках і друкуецца ў падпольнай друкарні».

Капітуляцыя „сталёвага шлёму“

БЭРЛІН, 28. (БЕЛТА). Вольф паведамляе, што кіраўнік «сталёвага шлёму» міністар працы Зэльдтэ заявіў аб сваім уступленьні у нацыянал-сацыялісцкую партыю. Зэльдтэ заявіў пры гэтым, што ён сам, а значыць і «сталёвы шлём» пераходзяць у падначаленьне Гітлеру.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

*** Правадыры германскага рэфармісцкага прафсаюзу дрэваапрацоўшчыкаў на чале з Тэрновым пастанавілі выйсьці з міжнароднага аб'яднаньня дрэваапрацоўшчыкаў.**

*** Сітроен** апублікаваў паведамленьне аб тым, што адкрыцьцё заводаў і спыненьне лёкауту адкладаецца на нежрэсьлены час.

Белкантора ВО „ТОРГСІН“

абвяшчае, што

з 15-га МАЯ 1933 г. па Менску

спыняецца прыём таварных ордэраў ВО „Торгсін“

ва ўплату за тавары і **ПАЧЫНАЕЦЦА абмен нескарыстаных ордэраў на таварныя кніжкі ВО «Торгсін»**, устаноўленага ўзору

АБМЕН таварных ордэраў на кніжкі праводзіцца ва ўсіх магазынах і органах В-О „ТОРГСІН“, — у горадзе выдачы ордэра.

ТЭРМІН АБМЕНУ вызначаецца **з 15 мая па 15 чэрвеня 1933 г.**

Белкантора В-О «Торгсін» просіць усіх трымальнікаў таварных ордэраў **паклапаціцца аб прадстаўленьні іх да абмену на працягу ўказанага тэрміну.**

Непрадстаўленыя у вызначаны тэрмін да абмену **таварныя ордэры В-О «Торгсін» будуць анулёваны і ніякія прэтэнзіі пасьля 15 чэрвеня г. г. прымацца ня будуць.**

Беларуская кантора В-О «ТОРГСІН».

МЕНСКІ ГАРАДЗКІ САВЕТ

І ЯГО АДДЗЕЛЫ:

фінансавы, зямельны, нарасьветы, Гарснаб, Гарліт, Газдраў, Наргасулік, фізкультуры, аргмасавы аддзел, гарадзкая плянавая камісія, аддзел радыёвяшчаньня, інспэкцыя мясцовай прамысловасьці і ўпаўнаважаны па загатоўках—

з памяшканьня на пляцы Волі, № 4

перамясьціўся

ў памяшканьне

па вул. Карла-Маркса, д. № 14

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)

СЁНЬНЯ

ПЛЯЦДАРМ

Пачатак у 8 гадз. веч.

ПАСТАНОВА

Менскага гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

28 красавіка 1933 г. *гор. Менск*

АБ СЬВЯТКАВАНЬНІ 1-га МАЯ

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў **пастанаўляе:**

1) 30 красавіка, у 7 гадз. вечара правесьці ўрачыстае пасяджэньне пленуму гарсавету з прадстаўнікамі партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных арганізацый і вайсковых часьцей, прысьвечанае 1 маю.

2) Абавязаць кіраўнікоў дзяржаўных, грамадзкіх, кааперацыйных устаноў, прадпрыемстваў, жактаў, жытлётэсту і ўласьнікаў прыватных домаўладаньняў правесьці да 17 гадзін 30 красавіка атыстку вуліц, падъездаў і двароў. Упрыгожыць займаемыя памяшканьні і домаўладаньні сьцягамі, лёзунгамі і плякатамі па ўказаньні камісіі па правядзеньні 1 мая.

3) Абавязаць усе дзяржаўныя, кааперацыйныя, гандлёвыя магазыны і крамы да 17 гадзін 30 красавіка арганізаваць у крамах вітрыны сваіх тавараў. Вітрыны магазынаў і крам упрыгожыць партрэтамі правадыроў і лёзунгамі.

4) Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на Р.-С. міліцыю.

Нам. Старшыні Менскага Гарадзкога Савету КАРАНЕЎСКІ.
За сакратара Менскага гарадзкога Савету ПАЛІЧАНСКІ

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менскага гарадзкога Савету ад 26-IV-33 г.

Дазволіць Менскай электрастанцыі зрабіць рамонт турбагенэратара з 12 гадзін ночы 30 красавіка да 7 гадзін раніцы 7 мая г. г.

На гэты час устанавіць наступны парадак працы прадпрыемстваў:

1, 2 і 3 мая г. г. з 21 гадзіны да 24 гадзіны трамвайны рух скарачаецца на палову.

3-га мая з 12 гадзін ночы да 7 гадзін раніцы 7-га мая электрастанцыі не ключаюцца наступныя прадпрыемствы:

Лямцавая ф-ка, арцель «Сёрпа», бандарны завод, усе прамарцелі, мабасная ф-ка, ф-ка імя Крупскай, шкотачная ф-ка, галантарэйная ф-ка, на па сваіх электраўстаноўках з 12 гадзін ночы 30 красавіка да 7 гадзін раніцы 7 мая заводы: «Вальшэвік» і імя Мо[illegible] на шляху да [illegible]

4-га мая забясьпечыць [illegible] вечара) наступныя кінатэатры: [illegible]

[illegible] французкія сацыял-дэмакраты, у адпаведнасьці з тагачаснай палітыкай сваёй буржуазіі, разглядалі як цэнтральнае пытаньне міжнароднай палітыкі— устанаўленьне франка-германскага зблізжэньня,—то абвастрэньне франка - германскіх супярэчнасьцяй вызначае заняцьце германскай і французкай сацыял-дэмакратыяй варожых адна адной пазыцый і распад II Інтэрнацыяналу. Гэта паказвае, што фразы аб Інтэрнацыяналізьме II Інтэрнацыяналу ў пасьляваенны пэрыяд заўсёды былі хлусьнёй.

У процілегласьць распаду II Інтэрнацыяналу 4 жніўня 1914 году, яго новы распад не зьяўляецца здрадніцтвам. Та ды, у 1914 годзе сацыял-дэмакратычныя партыі здрадзілі сваім уласным рашэньням, накіраваным супроць абазрэньня [illegible] германскага [illegible]альная палітыка [illegible]цыі усей пасьляваеннага (таксама, як і ваеннай германскай сацыял-дэмакратыі) працоўніцтва с.-д. у II Інтэрнацыяле ў той пэрыяд, калі германскіяпрэзыдэнты гэта яшчэ дапускалі [illegible] спрыялі, было нічым іншым, [illegible] абароны тых-жа інтэрэсаў германскага імпэрыялізму, у імя якіх германскія сацыял-дэмакраты цяпер фактычна [illegible] з II Інтэрнацыяналу.

[illegible] Леон Блюм абараняе імпэрыялістыя інтэрэсы сваёй буржуазіі, [illegible] застаючыся на глебе дэмакратыі, [illegible]цэй-бы, каб гэта дэмакратыя бы[illegible]цыйнага адзінага фронту пад кіраўніцтвам Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Заўсёды быў толькі адзін інтэрнацыяналізм: пралетарскі інтэрнацыяналізм сусьветнай рэвалюцыйнай партыі пралетарыяту.

Няхай-жа найшырэйшыя рабочыя масы з факту распаду II Інтэрнацыяналу пакарпнуць яшчэ адзін рэмізочы доказ, які яшчэ раз пацьвердзіць, што камуністы мелі рацыю, калі яны заяўлялі, што II Інтэрнацыянал заўсёды быў органам зьнешня зьяляючым сацыял-імпэрыялістычным партыі, гэта значыць арганізацыяй здрадніцтва інтэрэсаў пралетарыяту ў міжнародным маштабе, падобна да таго, як яго сэкцыі—сацыял-дэмакратычныя партыі—ажыцьцяўлялі гэта здрадніцтва інтэрэсаў рабочых у нацыянальным маштабе.

Менск, друкарня «З